Ба 227 310

А. Гаруи.

Матчин дар.

Ба 2

Ба 227310

АКАДЭМІЧНАЯ БІБЛІОТЭКА
БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

А. ГАРУН

МАТЧЫН ДАР

Пад рэдакцыяй
акад. І. І. ЗАМОЦІНА

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК
МЕНСК — 1929

БССР

БЕЛАРУСКАЯ
АКАДЭМІЯ
НАВУК

АКАДЭМІЧНАЯ БІБЛІОТЭКА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

КНІГА ТРЭЦЯЯ

КОШТАМ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК
У МЕНСКУ — 1929

Аб 79276
Ба 227 310

А. ГАРУН

ИЮ II 1958

Ба 227 310

МАТЧЫН ДАР

ДУМЫ і ПЕСЬНІ

1907 — 1914

ПАДРЫХТАВАНА КАМІСІЯЙ ДЛЯ ВЫДАНЬНЯ
ТВОРАЎ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

Пад рэдакцыяй
акад. І. І. ЗАМОЦІНА

Бел. аддзел
1994 г.

Чр 33

МЕНСК — 1929

Выпускаецца з дазволу
Прэзыдыуму БАН.

227310

Друкарня Бел. Акад. Навук. Зак. № 380. Галоўлітбел № 234. Тыраж—1500.

10. 03. 2010

Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

ПРАДМОВА.

Аднэй з чарговых задач у пляне Камісіі для выданьня твораў беларускіх пісьменьнікаў зьяўляецца і выданьне збору твораў А. Гаруна (А. Прушынскага). Гэты збор твораў, у які павінны ўвайсьці ня толькі вершы А. Гаруна, але і яго мастацкая проза і драматычныя творы, падрыхтаваны да друку. З двох аддзелаў яго вершаў, ужо скончаных друкаваньнем, першы заняты вядомым зборнікам вершаў А. Гаруна „Матчын Дар", першае выданьне якога зьявілася ў 1918 г. і цяпер ужо цалкам разышлося.

Улічваючы, з аднаго боку, пэўную вартасьць гэтага зборніку вершаў А. Гаруна, як найбольш мастацка апрацаванай часткі яго літаратурнай спадчыны, а з другога—тэхнічную магчымасьць перавыдаць зборнік зараз-жа, не чакаючы зьяўленьня ў сьвет поўнага акадэмічнага выданьня твораў А. Гаруна, Беларуская Акадэмія Навук знайшла пажаданым першы аддзел збору яго твораў, г. зн. зборнік „Матчын Дар", выпусьціць асобнай кніжкай, незалежна ад поўнага збору твораў, куды „Матчын Дар" у сваю чаргу ўвойдзе ў якасьці першага аддзелу.

Тэкст твораў А. Гаруна для іх акадэмічнага выданьня ўстаноўлены Камісіяй, як звычайна, на аснове ўсіх сабраных варыянтаў як друкаваных, так і рукапісных. У прыватнасьці для тэксту зборніка „Матчын Дар" прыняты быў наступны парадак: за аснову ўзяты тэкст зборніка выданьня 1918 году, якое было падрыхтавана да друку самым аўтарам; але ў тых выпадках, калі тэкст зьяўляўся шурпатым ці нават няпэўным у адносінах сэнсу, лексыкі ці мэтрыкі, у яго ўносіліся некаторыя папраўкі з адпаведных аўтографаў ці друкаваных варыянтаў. Правапіс у нашым выданьні зборніка

„Матчын Дар"—таксама як і ва ўсім зборы твораў А. Гаруна,—прыняты сучасны з звычайнымі адхіленьнямі ў тых мясцох, дзе пераклад тэксту 1918 г. на сучасны правапіс значна парушаў-бы лексыку пісьменьніка ці яго вершаскладаньне.

Такім чынам, параўнальна з тэкстам выданьня „Матчынага Дару" 1918 году, г. зн. з тым тэкстам, якім да гэтага часу звычайна карыстаўся чытач ці непасрэдна ці з дапамогаю выпісаў або крытычных і гісторыка-літаратурных нарысаў, тэкст, які перавыдаецца цяпер, адрозьніваецца ня толькі правапісна, але ў некаторых (праўда, нямногіх) мясцох таксама і лексычна і фразэолёгічна. Каб даць чытачу, які прызвычаіўся да папярэдняга тэксту, адпаведныя тлумачэньні, Камісія знайшла патрэбным увесьці ў кніжку самы сьціслы набор уваг, не загружаючы яго лішнімі даведкамі і дадаткамі. Больш падрабязны крытычны апарат да зборніку „Матчын Дар" і да ўсіх наогул твораў А. Гаруна, пабудаваны на аснове таго рукапіснага архіву, які знаходзіцца ў Камісіі, будзе даны ў поўным акадэмічным выданьні твораў пісьменьніка.

У склад поўнага акадэмічнага выданьня твораў А. Гаруна ўваходзіць і крытычна-біографічны нарыс, у якім будуць сконцэнтраваны як папярэднія так і нанова здабытыя фактычныя даныя аб пісьменьніку, якія малююць абстаноўку яго дзейнасьці, а таксама будзе дана псыхоідэолёгічная ацэнка яго літаратурнай продукцыі, якая, ня трацячы і зараз свайго мастацкага значэньня, у ідэолёгічных адносінах павінна быць адзначана як месцамі зблытаная, нявытрыманая і чужая нашаму часу. У даным-жа выданьні даецца напісаны А. І. Барычэўскім кароткі нарыс з самымі неабходнымі весткамі біографічнага характару і з некаторымі заўвагамі аб ідэолёгічнай устаноўцы „Матчынага Дару".

У падрыхтоўцы гэтага выданьня прымалі ўдзел наступныя асобы: тэкст устаноўлены Камісіяй у складзе І. І. Замоціна, М. М. Піотуховіча, А. І. Барычэўскага, В. Т. Мачульскага пад агульнай рэдакцыяй І. І. Замоціна. Падбор неабходных уваг зроблены В. Т. Мачульскім.

І. Замоцін.

А. ГАРУН І ЯГО „МАТЧЫН ДАР".

Зборнік вершаў А. Гаруна пад назваю „Матчын Дар" паводле сваіх мастацкіх асаблівасьцяй зьяўляецца выдатным фактам у літаратурнай продукцыі так званай „нашаніўскай эпохі". Але паводле сваёй соцыяльнай прыроды вершы А. Гаруна выклікаюць шэраг сур'ёзных заўваг і асьпярэчаньняў, паколькі амаль усе яны (за некалькімі выключэньнямі) псыхоідэолёгічна далёкі ад нас і нават у некаторай сваёй частцы чужыя і варожыя нашай сучаснасьці.

Паданыя ніжэй біографічныя даведкі аб А. Гаруну і крытычныя нататкі аб яго зборніку маюць сваёй мэтай сконцэнтраваць увагу чытача на клясавым твары аўтара і на псыхоідэолёгічнай накіраванасьці яго вершаў, зьмешчаных у „Матчыным Дару".

Алесь Гарун — псэўдонім Аляксандра Ўладзімерава Прушынскага, які радзіўся ў Менску ў 1887 годзе ў сям'і рамесьніка. Яго бацька займаўся, галоўным чынам, цясьляр-скай і сталярнай працай. А. Гарун вучыўся спачатку ў прыхадзкой школе і, пасьля яе сканчэньня ў 1897 г., паступіў у менскую рамесьніцкую школу, якую скончыў у 1902 г. У гэтай школе ён атрымаў і профэсыю, — ён стаў столярам. Усё сваё жыцьцё А. Гарун займаўся самаадукацыяй, у чым праявіў вялікую энэргію. З 1904 г., пад уплывам рэволюцыйнага ўздыму таго часу, ён — актыўны ўдзельнік арганізацыі соцыялістых-рэволюцыянэраў максымалістых, вядзе пропаганду ў гурткох вучнёўскай моладзі, друкуе і распаўсюджвае агітацыйную літаратуру. Сярод гэтай літаратуры яму сустракаліся грамадзка-політычныя вершы Цёткі. Магчыма, што пад іх уплывам ён і сам пачаў пісаць агітацыйныя вершы. Яны не дайшлі да нас, але вядома, што, агітуючы

ў 1905 г. на вёсцы, ён часта дэклямаваў і свае ўласныя вершы.

У рэволюцыйным руху А. Гарун прымаў удзел тры гады. У 1907 г. ён быў арыштаваны. Суд прысудзіў яго ў катаргу з заменай яе на ссылку. Яго пасялілі ў Іркуцкай губ. у Макараўскай воласьці, на рацэ Лене, у 71 вярсьце ад г. Кірэнску. Ссылка А. Гаруна трывала 9 гадоў. Зборнік вершаў, які чытач трымае ў сваіх руках, і зьмяшчае ў сабе творы, якія былі напісаны поэтаю, галоўным чыным, у часе яго ссылкі. У 1911 г. ён паступае на службу да параходнага прадпрыемства Глотавых і жыве ў вёсцы Мельнічнай ля Кірэнску. У 1914 г. А. Гарун атрымаў права запісацца ў сяляне і жыць дзе хоча ў межах Сібіры. У гэтым-жа годзе ён закончыў зборнік сваіх вершаў „Матчын Дар", які быў перасланы ў Вільню, дзе яго выданьнем хацела заняцца „Беларускае Выдавецкае Таварыства". Паўстаўшая вайна адсунула выйсьце кнігі на цэлых 4 гады.

У 1917 г. А. Гарун вярнуўся ў Менск. У 1918 г. зьяўляецца „Матчын Дар". У сваёй грамадзка-палітычнай дзейнасьці А. Гарун далучыўся да тэй нацыянал-дэмократычнай беларускай інтэлігенцыі, якая вызначылася ў гэтыя бурныя гады сваёй гатоўнасьцю служыць усялякай окупацыйнай імпэрыялістычнай уладзе, абы толькі не дапамагаць клясавай барацьбе рабочых і сялян. Асабліва выявіў сябе А. Гарун у пачатку польскай окупацыі, калі ён офіцыйна вітаў Пілсудзкага і стаў працаваць у беларускай вайсковай камісіі. Гэтае супрацоўніцтва з уладай белапалякаў прадстаўляе сабой найбольш ганебную пляму ў жыцьці А. Гаруна: поэта заняў позыцыю яўна варожую рабочым і сялянам Беларусі. У час эвакуацыі ён выехаў разам з белапалякамі. У дарозе высьветлілася, што ён зусім хворы, дзеля чаго ён быў накіраваны ў лязарэтным цягніку ў Кракаў. Там ён у 1920 г. памёр.

Аб А. Гаруне апошніх гадоў, А. Гаруне пэрыоду польскай окупацыі, наступнае сказаў Р. Шукевіч-Трацьцякоў: „Шчырая, глыбокая любоў часта бывае сьляпой. Такой была і любоў Гаруна к роднай Беларусі. Хоць з самым чортам, ня тое што з панам Пілсудзкім, гатоў быў ён заключаць

саюзы, каб толькі бачыць Беларусь — ня мужычую, рабочую, а якуюсь іншую, буржуйна-дэмократычную. І бясслаўна загінуў Гарун. Не дзеля суду і абвінавачаньня ўспамінаем мы сёньня няшчасны лёс здольнага поэты, але адарванага ад палітыкі і жыцьця старога рэволюцыянэра, а дзеля навучаньня. На абмылках мінулага вучымся мы. Няхай-жа паслужаць абмылкі жыцьця Гаруна навукай усім, ня маючым практыкі палітыкам, усім тым, хто цалкам ці часткай зьбіраецца пайсьці па яго шляху".

А. Гарун лічыў сябе рэволюцыянэрам, лічыў сябе сацыялістым. Ён, сапраўды, аддаў рэволюцыйнаму руху сваё юнацтва, але гэты ўдзел застаўся ў яго жыцьці толькі эпізодам. Перараджэньне нашаніўцаў пасьля рэволюцыйнага ўздыму ў лібэральную інтэлігенцыю зачапіла і А. Гаруна. Дзякуючы вялікім усілкам ён стаў чалавекам асьвечаным з немалымі ведамі ў галіне беларусазнаўства і ў галіне поэтыцкай творчасьці. Але ў галіне грамадзка-палітычнай ён ня здолеў падняцца на адпаведную вышыню. Як відаць з аднаго яго лісту, ён разумеў, што сусьветная вайна была падрыхтавана капіталістымі і банкірамі, якія шукалі новых рынкаў, але прадумаць да канца клясавыя прычыны нацыянальных войнаў, нацыянальнага прыгнечаньня і зрабіць належны вывад, што задача вызваленьня беларускіх працоўных мас у сапраўднага рэволюцыянэра павінна быць координавана з барацьбой супроць клясавага прыгнечаньня наогул, — гэтага выводу А. Гарун ня здолеў зрабіць, і дзеля гэтага проблема вызваленьня Беларусі атрымала ў яго самамэтнае значэньне; вырашыць яе людзі, да якіх належаў А. Гарун, спадзяваліся то з дапамогай Вільгельма II, то з дапамогай улады Пілсудзкага, — гледзячы па абставінах. Да чаго вядзе гэткая політыка, мы бачылі на жыцьцёвым вопыце А. Гаруна. „Сьляпое каханьне" і склала асяродак тэй трагедыі, якой закончылася жыцьцё аўтара „Матчынага Дару".

Тое, што А. Гарун не разумеў ці не хацеў зразумець клясавага характару тых боек, якія адбываліся перад яго вачмі, было зьвязана з тым, што ён наогул затушоўваў значэньне клясавай структуры грамадзтва. Гэта відаць з тэй

ідэалізацыі мінулага Беларусі, якую знаходзім у яго вершах. Беларускі народ, па яго словах (верш № 4), калісьці

Меў вялікія кляйноды,
Быў і моцны і багаты.

Тую-ж самую думку знаходзім мы і ў вершы № 9:

Ў старыну Беларус, не падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою.

А. Гарун ігноруе той факт, што беларускія працоўныя масы былі заўсёды прыгнечаны. Сапраўдная моц працоўнай Беларусі, сапраўдная воля, сапраўднае багацьце — ня ў мінулым, а ў сучасным і будучым і пры гэтым незалежна ад таго, якім было ея мінулае.

Рамесьнік А. Гарун не ўяўляў сабе вялікай ролі пролетарыяту, які вышаў на арэну гісторыі, каб даць ёй зусім новы напрамак.

А. Гарун — прадстаўнік беднага гарадзкога мяшчанства, якое было зьвязана з вёскай. Дзеля гэтага ён моцна перажываў пакуты гэтых пластоў грамадзтва, несправядлівасьць эканомічнай няроўнасьці (верш № 10), жах беднасьці, жабрацтва, пакінутасьці (верш № 63 — „Хатка“, верш № 65 — „Жабрачка“), клікаў, хаця-ж і ў вельмі расплыўлівых формах, да барацьбы за лепшую будучыну, да будаваньня новага жыцьця (верш № 40 — „Муляру“). Але ў той-жа час ён дае нацыяналістычную ідэалізацыю беларускай гісторыі і шукае ў гэтай фальшыва асьветленай мінуўшчыне залог будучага. Тут ён нам ня толькі далёкі, але і варожы. Тут мы знаходзім парасткі таго сучаснага нацыяналізму, з якім Комуністычная партыя і Савецкая ўлада вядзе бязупынную барацьбу.

Адзначаную намі політычную серадзіннасьць, характэрную для А. Гаруна, як прадстаўніка дробнага мяшчанства, можна прасачыць і на яго адносінах да рэлігіі. Паводле ўспамінаў людзей, якія ведалі яго, ён быў няверуючым. Антырэлігійныя мотывы яскрава гучаць у вершы „На сьмерць“ (№ 26):

Ці-ж можна праўду нам знайсьці, калі маліцца,
У неба чорнае ўляпіўшыся вачмі?

З журбой, з сьлязьмі
Нясьці туды сваю найбольшую з надзей?

і ў вершы „Поэту“ (№ 46):

Пакінь, пакінь сьпяваць а праўдзе тэй, што ў небе:
Яна чужая нам, таемных праўда сіл.

І ўсё-ж і тут ён застаецца нявытрыманым. Яму ня была чужой некаторая містычнасьць. Ён ня толькі любіў браць для сваіх вершаваных апавяданьняў сюжэты з элемэнтамі рэлігіі і містыкі (вершы №№ 70, 71, 72), ня толькі часта карыстаўся рэлігійнымі вобразамі і запазычанымі з рэлігійнага кола прадстаўленьняў выразамі, але браў і чыста містычныя тэмы (вершы №№ 34, 35, 37). Такім чынам і свой адмоўны погляд на рэлігію А. Гарун ня здолеў правесьці пасьлядоўна, як ня здолеў у галіне грамадзка-політычнай зрабіць вывады з тых зьявішч нацыянальнага ўціску, эканомічнай няроўнасьці, беднасьці і жабрацтва, якія часамі вельмі мастацкі ўцелясьняў у сваіх вершах.

А. Барычэўскі.

I

МАТЧЫН ДАР

ДУМЫ і ПЕСЬНІ

1907—1914

Гэту першую кніжку
думак і песьняў сваіх
матцы сваёй прысьвячаю.

1.

ЛЮДЗЯМ.

Люблю і я скляпеньне зор,
Люблю зямлі абшар,
І роўны луг, і ўзгібы гор,
І шум лясны, і гвар.
Люблю жыцьцё, а ў ім людзей
І кшталты іхніх душ;
Люблю вянкі плясьці з надзей,—
А ня поэт.—Чаму-ж?

Часамі праца ў дзень кіпіць,—
Цярплю і я прыгон,—
Аж косьць аб косьць ў плячы рыпіць...
Пачуеш ў сэрцы звон,—
Ухопіш зык, за ім другі,
За тымі больш ідуць,
Зьліюцца ў шых даўгі-даўгі
І цэлы дзень гудуць.
Загасьне дзень, іду дамоў,
Кладуся спаць,—і ў ноч
Цякуць радкі зьвінючых слоў,
І сон адходзіць проч.
Тагды пішу. Перад вачмі
Нясецца зданьняў рой,
І хтось стаіць па-за плячмі,
Здаецца, блізкі, свой.
Абыйме шыю пара рук
І кос дзявочых шоўк,
Ўзмацніцца ў сэрцы мерны стук,

А звон ў душы ня змоўк...
Зірну: пакой пусты, няма...
А час сьлізнуў, як вуж.
І за вакном радзее цьма...
А ня поэт...—Чаму-ж?

Бо мой прыгон глытае час,
Мне воля—рэдкі дар.
Такіх поэтаў шмат у нас,
Дзе сам народ—пясьняр.
Сваіх тут жменьку я сьпісаў
Маркотных песьняў-дум;
Маёй душы іх сам сьпяваў
Па краю родным сум.
Скажу яшчэ чаго-б хацеў:
З дзявочых вуст пачуць
Хаця-б адзін мой бедны сьпеў,
Хаця-б калі-нібудзь!

2.

* * *

Чаму з маленства, з ураджэнства,
Ў жыцьцёвы май,
Ня ўмеў, як маці, шанаваці
Цябе, мой край?

То-ж я з тваёю ключавою,
Сьвятой вадой
Напіўся болю аб нядолі,
Бядзе людзкой.

То-ж ты, мой хмуры, даў мне пануры
І ціхі гнеў,
А днём падчасным, так пекным, ясным,
Надзею грэў.

Твае-ж курганы, лясы, паляны,
Дубкоў тых шум,
Палёў абшары, люд бедны, шары,
Мне далі дум.

А дум тых многа... Не, ня убога
Ты даў мне іх,
І ты-ж, як маці, наўчыў сьпяваці
Аб думах тых.

Я браў, ня бачыў і не аддзячыў
Табе нічым,
Бо счараваны,—цябе, ўкаханы,
Ня знаў саўсім.

Цяпер хоць знаю, дык што-ж параю
Ад позьніх скрух?
Ў чужой краіне паволі гіне
За целам—дух.

Вазьмі-ж хоць сьпевы, дум перапевы
Лясоў тваіх,—
З тваёі глебы, з тваёга неба
Узяў я іх.

3.

НАЧНЫЯ ДУМКІ.

Часам я ўночы сны дзіўныя бачу:
Роіцца нейкі нязьведаны край,
Повен то шчасьця, то жаласьці, плачу,
То зло-хмурлівы, то сьветлы, як рай.

Бачу вялікія стэпы з-над Нёмна;
Туліць у сьлёзах матуля сынка;
Сьцелецца пушча глухая і цёмна;
Косьці з магілы глядзяць бедака...

Бачу я—жоўтае жытняе поле
Коласам ціха шуміць-шалясьціць,
Межы, курган векавечны і хвоя,
Каня з аднэю малітваю „піць"!

Траўка ў ляску у цяню вырастае,
Корміцца сокам зямелькі сырой;
Птушка шчабеча—людзей пацяшае;
Льлецца крынічка, плюскоча вадой.

Ночкай ля рэчкі раздольна, прывольна!
Гуртам русалкі сьмяюцца, пяюць;
Кветкі купальскай шукае бяздольны;
З зельлем шаптухі паціху снуюць...

Хочацца быць мне ў тым краю нязнаным,
Хочацца край той абняць з прастаты,
Хочацца крыкнуць: гэй, краю каханы,
Будзь мне, як маці, будзь родным мне ты!

БССР ... імя Леніна ...

Дай мне зрабіцца крынічкай лясною,
Бераг вадой абмываць, цалаваць;
Дай мне век цэлы дружыці з табою,
Хвойкі і зоры ў сабе адбіваць.

Дай мне купальскую кветку у рукі,
Путы жалезныя мне разьвяжы,
Дай ты мне зельля на гора і мукі,
К шчасьцю гасьцінец мне дай, пакажы-
. . . . . .

Ціха. Нічога ня чую, ня бачу.
Роіцца толькі нязьведаны край,
Повен то шчасьця, то жаласьці, плачу,
То зло-хмурлівы, то сьветлы, як рай...

4.

* * *

Як надарыцца мінута,
Што ад працы адарвуся,
І жыцьцёвая атрута
Не пячэць, і прахаплюся,
Дык цябе, мой Родны Краю,
Шчырай думкай аблятаю.

Ты няшчасны і убогі,
Ты бяздольны і забіты,
Ты бяз шляху, без дарогі,
Ты абдзёрты і прапіты,
Подлай здрадаю праданы,
Ты ня свой,—даўно забраны.

Меў вялікія кляйноды,
Быў і моцны і багаты,—
Задзіўляліся народы,—
А дазнаўся горкай страты.
Сохнеш, вянеш,—вокам кіну,
Аж здаецца, што загінуў...

А як сонейка устане
І прыемна усьміхнецца,
Па палетках, на кургане
І па вёсцы разьліецца,
Як паводка,—Родны Краю,
Над цябе тагды ня маю!...

Ты квяцісты, залаціcты,
І прыгожы, і аздобны,
Ты лясісты, каласісты,—
Можа рай табе падобны.
Колькі-ж моцы маеш скрытай,
Колькі сілы неспажытай!

Ты паўстанеш, працавіты,
Гаратнічы, нявымоўны,
Шчасьця, долі прагавіты,
Мой сланэчны, мой чароўны!
Будзе час, пабачаць сьведкі,
Хоць ня мы, дык нашы дзеткі.

5.

* * *

Хай ня льлюцца дажджы цёмна-хмарныя
Над зьмярцьвелаю пашаю,
Хай пачнуцца гады хлебадарныя
Над зямелькаю нашаю.
Хай красуецца жытам, пшаніцаю,
Каласочкамі цяжкімі,
Хай ўзмацуецца боскай правіцаю
І ўсятворчымі ласкамі.
Хай асьвеціцца праўды навукаю
І братэрскаю згодаю,
Хай зьнявечацца крыўда з прынукаю
За яе загародаю.
Хай ўзьлятаець хвала яе племяні,
Упякнёнага цнотамі,
Хай шыбаець над скаламі з крэменю,
Над арлінымі ўзьлётамі.

6.

* * *

Мілая, родная старонка-маці!
Моцна цябе я і шчыра люблю,—
Бедныя ніўкі твае, сенажаці
І нешчасьлівую долю тваю.

Горам, матуля, цяпер ты замучана,
Стогнам спавіта у сець з ланцугоў,
Рукі і ногі да слупа прыкручаны,—
Ціха наругу ты зносіш, бяз слоў.

Толькі-ж уцешся, матуля каханая!
Слуп твой патроху пачаў падгніваць,—
Прыдзе к нам воля, сьвятая, чаканая,
Сець з ланцугоў як пачнём разрываць.

7.

ВАЎКАЛАКІ.

Ваўкалакі цёмнай ноччу
З дамавін выходзяць
І лятаюць скрозь па сьвеце,—
Сабе жэр знаходзяць:
Дзе старое ці малое
Сьпіць у сьне глыбокім,
Ваўкалака падсьцігае
Ненасытным вокам.
Не пачуеш, як узьляжа
На грудзях навала,
Не пачуеш, як ён з сэрца
Высьсе кроў памалу.
Галасіста-ж па сьвітаньню
Засьпяваюць пеўні,—
Ваўкалака адлятае
Неахвотна, гнеўны.
Па старонцы роднай здаўна
Ваўкалакі ходзяць,
Але-ж пеўні не сьпяваюць,—
Слонка ня ўзыходзіць!..

8.

І В А Н К У.

Слухай, Іване, паночку,
Кепска ты робіш, браточку!
Хіба-ж ня сорам так жыць,
Гэткім нядбайлівым быць?

Ўзглянь навакол на суседаў,
Некалі добра іх ведаў:
Хто з іх спусьціўся, як ты,
Мае з тваё беднаты?

Хіба-ж яны галадуюць,
Хіба-ж патвойму бядуюць?
Ў іх і апратачка ёсьць,
Й часам пакорміцца госьць.

Гэта-ж, дзе людзі зьбяруцца,
Зараз з цябе пасьмяюцца,
Кажуць:—„гультай, абібок".
Так яно, мой галубок!

„Бацька яго ў гаспадарстве
Быў, як-бы цар ў сваім царстве:
Быў ў гаспадарчцы лад,
Мелася вока, дагляд...

Быў чалавек яго татка!
Ён-жа,—дзівіся: апратка
Ў дзюрках, у гнідзе, сьцвіла,
Ў хаце—трава абыйшла.

Нейкае дзіва, ды й годзе!“
Часам жартуюць ў народзе:
„Моцны гультай, моў-ся, вол,
К працы-ж пагнаць—трэба кол“.

Чуеш ты, чуеш, Іванка,
Што у людцоў за гуканка?
Слухай, над кім гэты сьмех?
Грэх табе, братачка, грэх!...

Дз 19276

9.

* * *

У чатырохлецьце „Нашае Нівы".

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй ня цурайся;
Як ня зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэта скарб нам адзін захаваўся,—
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён незабраны астаўся.

Ў старыну Беларус, не падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далёка у сьвеце быў знаны
За літоўскай і ляскай зямлёю.

Але час прамінуў, і нядоля
На народ, як-бы камень, звалілась;
Беларуская слава і воля
Адыйшла, адцьвіла, закацілась.

Не зьмяняючы шэрай апраткі,
Працаваў ты, як вол, гаратліва,
А у хаце тваёй недастаткі,
А на ніве тваёй неўрадліва.

А чаму? Ты няздольны, ці хворы,
Ці благі гаспадар, ці п'яніца?
Мусіць не! Бо і іншым у пору
У цябе гаспадарыць наўчыцца.

Сьветлы розум твой, брат, але дзетак
Ад цябе, як і ўсё, адбіралі
І на бацькаўскі родны палетак
Працаваць—памагаць ня пушчалі.

Хто хацеў, той і сьмеў рабаваці,
Бяз прыпросу зьяжджаліся госьці—
Абдзіраць, аб'ядаць, апіваці
І крышыць гаспадарскія косьці.

Можа-б ты і памёр і загінуў,
Каб ня вешчая мова Баяна.
Хто-ж быў, добры, яе хоць пакінуў?
Як-жа так, што яшчэ не забрана?

Бо што бачылі госьцікі-гэрцы—
І зямлю, і лясы, і кілімы,—
Ўсё забралі, а мову у сэрцы,
Ў сваім сэрцы хавалі-нясьлі мы.

Дык шануй, Беларус, сваю мову—
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацьця-народы!

227310
Б 48319

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна
БССР імя Леніна Дзяржаўная бібліятэка

10.

Ю Д А М.

Да вас, паны, што голасна крычыце
Аб прыязьні сваёй да „беднага народу“,
Што раіце па-ліcьсему: „маўчыце!
Нядоўга вам дамо багацтва, волю, згоду,“ —
Да вас мой гэты верш і словы ўсе благія,
Бо словам вы адны, а справамі—другія.

„Багацтва вам“... Няма вам нашай веры!
Бо ў той-жа год ліхі, як ў полі не ўрадзіла,
Галоднаму на прокарм хлеба меры
Аднэй ня далі вы і злаялі няміла...

Калі для нас жадаеце багацтва,
Нашто з бяздольнага зьдзіраеце апратку?
На што-ж тагды вы плодзіце жабрацтва,
Дамы пустошачы бяз ліку, без астатку?

„Мы волю вам“... Пракляцьце вам і з ёю!
Чаму ад волі вашай мы стагнаць павінны?
Яна ланцуг над нашаю зямлёю,
Астрог на наш народ спакойны і бязьвінны.

Ня воля гэта! Што нам не цьвярдзіце,
Мы вольнымі былі за даўнімі часамі.
Ідзіце-ж проч! і з воляю ідзіце!
Да волі знанае хутчэй мы прыдзем самі.

„Мы згоду вам“... Пакіньце ашуканства!
Вы—бойкі братняе чарнейшыя прарокі,
Бяз звады вам, нашэптаў, падтыканства
Нямілы божы сьвет, ні ясны, ні шырокі.

Ня просім вас! ня трэба вашай згоды!
Сваё вялікае, дзядоўскае багацьце
Хаваем мы; ад бога ўсе народы
І бацькі аднаго ўсе дзеці, людзі—брацьця.

Адкуль вы к нам? Якога племя, роду?
З якіх краёў прыйшлі бяз праўды і бяз сэрца?
І што вам з нас, ад нашага народу?
Чаму так жычыце яму хутчэй памерці?

Га! Знаем вас, атручаньня найміты:
Вы—служкі чорныя Ясьнейшага Мамона,
Вы—мора бруд ля берагу намыты,
Бяз дум і без мазгоў, вы—золата бяз звона.

З усіх бакоў на послугі уціску
Чаргою воўчаю зьяўляецеся ўсюды,
Дзе клічуць вас для крыўды, для націску
На праўду вечную... Вы... імя вам Іуды!

Ідзіце-ж проч! Бясплодна ваша трата
На ласкі лісьсія. Пакіньце слова: „брат“!
Вы—цяжкі сон. Вы—каты... горай ката!
Кругом праклятыя, вам бацька, брат—дукат!

11.

ПЕСЬНЯ—ЗВОН.

Гэй, ты маці, родна мова,
Гэй, ты звон вялікі, слова,
Звон магучы,
Звон бліскучы,
З срэбра літы,
З злота зьбіты,
Загрымі ты,
Загрымі!
Гэй, званар, званар, мой пане,
Бі у звон, як змогі стане,
Без спачынку,
Бяз упынку,
Потам зьліты,
Ім умыты,—
Бі, звані ты,
Бі, звані!
Гэй, гусьляр, пясьняр, мой браце,
Грай, сьпявай у полі, ў хаце,
Дзе гарота,
Дзе галота,
Дзе нясыты,
Дзе няўмыты,—
Ім спыні ты,
Жаль спыні!
Струны хай грымяць і рвуцца
З болю, з гневу; хай сьмяюцца
Разам з імі,
Ня чужымі,—

Голас чысты,
Залацісты,
З імі зьлі ты,
З імі зьлі!...

12.

* * *

Я. Коласу.

Усе з аднэй мы выйшлі нівы,
І сейбіт нас адзін кідаў,
І кожан з нас той дзень шчасьлівы
Ў сваёй душы благаслаўляў.

А вецер быў. І хто цяжэйшы,
Астаўся там, куды упаў,
А хто, як я, хто быў лягчэйшы,
Ў далёкі сьвет памандраваў.

Бо сейбіт ёсьць другі на небе,
Што судзіць нам гады і дні,—
І ты узрос на роднай глебе,
Пусьціў глыбока карані.

Здалеў, браток, на сьвет прабіцца
Спраміж сьвірэпкі і асок!
І можам мы табой гардзіцца,
Прыгожы, слаўны Каласок.

Цьвіці-ж, расьці, буйней на дзіва
Ў сям'і прыгожых васількоў,—
З тваіх зярнят хачу, праўдзіва,
Убачыць поле каласкоў.

13.

ПЕСЬНЯ.

На чужой стараначцы
Заняпаў душой,—
І згубіў здаровейка
І згубіў спакой.
Не глядзелі-б вочанькі
На нялюбы сьвет,
Маладое радасьці
Прападае сьлед.

На чужой стараначцы
Ня цьвітуць сады,
Не сьпяваюць птушачкі,—
Не лятуць сюды.
І чужое лецейка
Для мяне—зіма,
І чужога соўнейка
Для мяне няма.

На чужой стараначцы
Ня шумяць лясы,
І няма прыгожасьці
Ў палявой красы.
Замірае душачка
На чужой зямлі,
А дамоў вярнуціся
Не ў маёй валі.

Дзе-ж вы, ніўкі родныя,
І дубовы шум?
Засьпявайце голасна,
Каб пазнаў, пачуў.
Ўскаланіце песьняю
Векавечных сноў,
Ўскаланіце душачку,
Ўскаланіце кроў.

14.

У ВЫГНАНЬНІ.

Край чужы—за веру кара,—
Сьнег, мароз ды горы.
Белы сьвет, як чорна хмара,
Заступілі горы.

Край чужы... І ты чужынец,
Ўсім ня свой здаешся:
Ходзіш скрозь, як той адзінец
Старакосны ў лесе.

Ходзіш ты, ніякай мэты,—
Так,—абы цягацца,
Знаць сабе: жывеш яшчэ ты...
Для чаго-ж, спытацца?

Хто цябе спагадным сэрцам
Да сябе прытуле?
Хіба з стрэльбы чужаверца
Чужаніца-куля.

Хто цябе спаткае міла,
Ў дом папросіць гожа?
Хіба дол, адно—магіла
Разгарнуцца можа.

Што з таго—часамі сьніцца
Край, ў якім радзіўся?
Толькі мусяць сьлёзы ліцца,—
Лепі-б і ня сьніўся!

15.

ВЯСЕЛЬЛЕ.

Гэй гуляй, ня думай,
Не глядзі панура!
Засьпявай, заіграй,
Загудзі віхурай!

Грошы ёсьць! Сала ёсьць!
Бутэль манапалькі...
Ты ня стой, трунак свой
Пі, гуляй і—толькі!

Былі мы... Жылі там—
На роднай краіне...
А цяпер тут—як зьвер...
Жыцьцё наша гіне.

Гэй, гуляй, налівай!
Будзем піці, браце!
Што у нас? Цяжкі час?
Э! аб чым казаці!

Га-га га! Бач, нага
Сама ў бокі скача,—
Заіграй, засьпявай!...
Не, брат: сэрца плача...

Дайце мне, дайце мне
Кварту ня пустую,—
Я мае, я свае
Сэрца пачастую.

От дык так! От дзе смак!
Эх ты, ведзьма-доля!
Яшчэ—не, мала мне...
Налівайце болей!

Гэй крычы, не маўчы,
Сэрцу дай пацеху!
Заіграй, засьпявай,
Сьмеху, болей сьмеху!

А што?! Не, вы мяне
Не забілі, гады!
Вось-жа п'ю, вось пяю
З сябручкамі рады!

Ты гуляй, не зважай,
Што сьляза на вочу,—
Гэта так, гэта я
Весяліцца хочу.

Пі, гуляй!
Грай, сьпявай!...

16.

ЖУРБА.

Сэрца болей не сьмяецца,
Сэрца плача жаласьліва.
Ці дасьць бог, ці давядзецца
Быці там, дзе наша Ніва?

Думкі, праца—ўсё далёка!
Песьні, казкі ў пазабыцьці...
Прад сабой я толькі вока
Бачу страшнага нябыцьця.

Волі, думак, шчасьця, сьмеху
Дайце мне! Хоць пакажыце!...
Але не... Мне на пацеху—
Вока страшнага нябыцьця.

Я-б узяў матыку ў рукі,
Карчаваў-бы, чысьціў поле,
Але—там... Я тут бязрукі,
Я бясьсільны... Я бяз волі.

Сэрца плача, і я плачу;
Плачу з сэрцам галасьліва.
Дзе ты, дзе ты, краю родны?
Край далёкі, маці-Ніва?

17.

ВОСЕНЬ.

Восень халодная, чорная, хмурая
Сунецца ціха, нячутна, што дзень;
Хварбы наўкола паклала панурыя,
Сонца хавае за чорную цень.

Збожжа пажатае з ніваў пазвожана,
Голыя гоні самотна ляжаць;
Неба дажджліваю хмарай абложана,
Траўкай ня грае сваёй сенажаць.

Кветкі ня сьвецяць галоўкамі яснымі,
Кусьце бяз лісту, бяз красак стаяць;
З гэтымі восені днямі бяскраснымі
Цяжкія думкі у сэрца ляцяць.

Вольхі, рабіны, асіны з бярозамі
Лістам пажоўклым тужліва шумяць:
„Хутка надыйдуць завеі з марозамі,
Ветры з сьнягамі ізноў наляцяць“.

Толькі высокія хвоі іглістыя
Вечна зялёны свой кажуць убор;
Днямі зімовымі, цёмна-імглістыя,
Будуць чарнець навакол, наузгор.

Зіму пачуўшы, мядзьведзь неспакоіцца,
Ходзіць па лесе, шукае бярлог;
Хмурны і злосны, пакуль супакоіцца,
Горш на скацінку, на людзі налёг.

Гусі і качкі гуртамі зьбіраюцца,—
Хутка на поўдзень саўсім паляцяць;
Хэўра за хэўрай на рэчцы зьмяняецца,
Ўранку крычаць на вадзе, лапацяць.

Так няпрыкметна часамі, дзянёчкамі
Восень зьмяняе аблічча зямлі...
З днямі бяз сонца, халоднымі ночкамі
Цяжкія думкі мне ў сэрца прыйшлі.

Нешта старое усё ўспамінаецца,
Толькі няясна, маўляў, праз туман;
Нейкі няведамы жаль уздыймаецца,
Вабіць і цягне ўспамінак-дурман.

Сэрца баліць пад жаданьняў прымусамі
Што за жаданьні—ніяк не пазнаць.
Можа ляцеці адгэтуль за гусямі?...
Можа заснуць, каб нічога ня знаць?...

18.

МАЕ ДУМКІ.

Па-на горах сьнягі паляглі,
І даліны убраліся ў белі,—
Мае-ж думкі, як толькі маглі,
Хутка з ветрам у даль паляцелі.

Паляцелі ў даль, дзе няма
Гэтых гор—вартаўнічых няволі,
Дзе ня гэтак сурова зіма,
Дзе прыняў я і жыцьце і долю.

Паляцелі спытаць, паглядзець:
Як жывецца на роднай старонцы?
Як той брат-беларус мой жывець?
Ці высока узьнялася сонца?

Там-жа ўсё, як раней, як было:
Беднасьць, ціша кругом і цямнота.
Дзе там шчасьце!—Жыцьцё зацьвіло,
Як наверсе якое балота.

Сонца нізка—ня грэе саўсім
І саўсім-жа ня сьвеце бязмала;
Раз блісьне дзе-ні-дзе—і паўсім,
І ізноў сваю твар захавала.

Колькі-ж будзеш ты спаць? Не пара
Табе, часам, мой браце, праспацца,
Каля бацькаўскіх ніў і двара
Працаваці зноў шчыра узяцца?

І усё, што утраціў сплючы,
Пазьбіраці да роднае хаты?
Годзе спаць! і ня будзе начы,
Будзеш вольны, разумны, багаты!

І высокае сонца тагды
Будзе працу тваю аглядаці,
І пазбудзешся крыўд і нуды,—
Будуць людзі цябе шанаваці.

19.

НАВАКОЛ...

Сьнягі, ляды,
абрус жуды,
назаўсягды,
на вечны час
ляглі.

Гара, скала
наўкол лягла
і узрасла,—
паўскрайны пас
зямлі.

Узрос на ёй
вялізаў-хвой,
туману з мглой
прытулак, лес
стары.

Прадзіўны мур
нярушных хмур,
як той каптур,
на бор узьлез
з гары.

сонца сьвет,
здалёка, з гэт!...
нябёс прывет,
ня здужыць к нам
дайсьці.

Адны вятры
праз хмар муры
лятуць з гары,
праз лес той сам,
гусьці.

І разам з ім
на жах благім
і добрым, ўсім,
тужлівы сьпеў
вядуць:

„Засьні, засьні...
у ноч ўсе дні
перамяні
і нас ня гнеў,
ня гудзь.

Скалей, як лёд,
на сотні год
І сэрца лёт
спыні, вярні
да сну...

А сонца сьвет,
здалёка, з гэт...
з нябёс прывет—
мана. Гані
ману!

Гані. Раі
тых дум спыні,

і жаль стаі,
і кінь з пяшчот
У цьмы.

На сьвет адны
твае паны
і вартаўны
табе пачот—
то-ж мы".

20.

ВЕТРУ.

Ветра, ветра вольны,
Стой, зрабі паслугу!
Буду спосаб меці,—
Аддзякую другу.

Зьлётай, лёгкі, борзда
У край, адкуль я родам,—
Бацьку, матку ўбачыш,
Мілую заходам;

Ўбачыш гэнам, ворле,
Ў краю тым—старонцы:
Брат мой беларусін
Гібее бяз слонца.

Ім усім паклонам
Нізкім ты скланіся,—
Хай жывуць, красуюць...
А потым вярніся.

Гэтта скажаш, браце,
Мне, што там убачыў.
Буду спосаб меці,—
Паглядзіш,—аддзячу!

21.

ЗАВІРУХА.

Завіруха скача ноччу
Патарочай, плача, вые;
Пухавыя сыпе ў вочы
Сьнегавінкі мне, рагоча.
Йду навобмацк; ледзь жывы я,
Няжывыя суну ногі
Без дарогі. Цела ные,
Калянее; верставы я
Прамінаю слуп убогі,
Троярогі крыж збуцьвелы,
Пасівелы, цёмны, строгі.
Не чакаю дапамогі...
Прыступае нехта белы,
Асьмялелы. Вот ўсьцігае,
Акаляе, скамянелы,
Пасінелы,—абнімае.
Завіруха-
Рагатуха сыпе сьнегу
І ў прабегу шэпча ў вуха:
„Заначуеш—не пачуеш:
Я завею, я угрэю,
Зараз ляжаш, дзякуй скажаш,
Мне ты скажаш“. Завіруха-
Рагатуха шэпча ў вуха.

Ажно чую: раптам злая
Улягае, уціхае

Завіруха. Замірае.
Праясьняе ў полі. Нікне,
А ня зыкне вецер-сватка.
Бачу—хатка.
Як тры зоркі, тры ваконцы
Пры гасьцінцы. Верацёнцы
Дыму ў неба ўюцца, пнуцца.
Хатка, вокны, дым, сьмяюцца,
Клічуць, вабяць, сустрачаюць,
Прывячаюць, запрашаюць.
Голас чую родных, мілых.
Ўзмацаваўшыся на сілах,
Крыкнуць рады: „згінь ты, гора!“
А яно ў адказ гавора:
— „Над табою
Сьнег гурбою“.

22.

ДУМЫ Ў ЧУЖЫНЕ.

Гора мне цяжкае, гора бясшчаснаму!
Сэрца ўсё жаліцца, плача, баліць.
Хочацца к сонейку цёпламу, яснаму:
Хоць-бы убачыць! Ўсю цяжкасьць зваліць!

Доля мая, што мяне узбагаціла,
Думак, жаданьняў і сэрца дала,
Недзе гаман з маім шчасьцем утраціла,—
З горам падняла і мне падала.

———

Што там наперадзе, што там нязнанае,
Што там са зьдзекам мяне сьцеражэ?
Скрытна-варожае, з страхам чаканае,
Можа і блізка на нейкай мяжэ.

Толькі ня сьмерць,—не аб ёй неспакоюся.
Сьмерць гэта што! Гэта дар для усіх,
Прыйдзе той час, і я з ёй заспакоюся,
Збыўшыся боляў і думак сваіх.

Іншае гора душу абцяжарыла,—
Камень цяжэйшы на сэрцы ляжыць,—
Дні майго росквіту мглою абдарыла,
Ў жыцьці штодзённа за мною бяжыць.

Доля мая,—гэта доля гаротная,
Сэрца дала мне, наўчыла любіць
Дый прысудзіла яна-ж, адваротная,
Век у сіроцтве, ў выгнаньні пражыць.

Што мне жыцьцё, хоць-бы самае краснае?
— Волі ня маю! Ў няволі жыву.
Гэтае нуднае быцьце уласнае
Сьмерцю страшэннаю з болем заву.

Сокалам вольным і з пташшай гульлівасьцю
Я-бы, здаецца, адсюль паляцеў...
Нельга і думаці,—доля бяз міласьці
Варту паставіла, вораг абсеў.

———

Беднасьць—ня гора саўсім мне бясскарбнаму;
Я багацей, замажней за другіх,
І не зайздрошчу багацтву я марнаму,
Досыць з мяне бедных злыдняў маіх.

Покі варушацца рукі скарэлыя,
Праца мне будзе на радасьць, на сьмех.
Злотам багатыя, сэрцам зьнішчэлыя,
Трутні ня меціму́ць гэткіх уцех.

Што мне багацтва? Бяз грошы, бяз золата
Быў-бы магнат я, кароль, багатыр
Там, дзе пад націскам роднага молата
Жыцьце куецца у глыб і у шыр.

Жыцьце куецца, і сонца ўздымаецца,
Сьвету праменьні ліець з гарыні,
З доўгага сну дзе народ прачыхаецца,
Побыту шчаснага сьвецяць агні.

Там, дзе цяпер яшчэ сілы нячыстыя
Жыцьце карожаць, па-свойму вядуць,
Дзе ўстрапянуліс дубы густалістыя
І на курганах нямоўчна гудуць,—

Можа і я з сваёй слабаю сілаю
Там працаваці-бы крышку памог;
З гэтаю працаю шчыраю, мілаю
Сьмерці спаткаў-бы спакойна парог.

Можа... А можа ня ўбачыці гэтага?
Можа суджона тут век мне пражыць?
Дні адзіноты, сіроцтва бясьсьветнага
Грудай каменьняў ў душы валачыць.

———

Страшна мне гэта, і ўсё-ж не ядынае
Так навалілась, гняце ў глыбіне,—
Горшая мука ўтрапляець, што сынам я
Быць перастану сваёй старане.

Памяць ня доўгая, любасьць ня вечная;
Сірасьць, безьлюднасьць—іх трудна нясьці;
Мо', пажагнаўшыся з старым на вечнае,
З шляху зьвярну, па другім каб ісьці.

Страшна мне нават аб гэтым і згадываць,
Страшна і думаць, і я не хачу.
Толькі-ж надзеі ня маю, чым зрадаваць
Сэрца і сьлёзы ссушыць у ваччу.

Вось у чым гора бадзязе бясшчаснаму,
Вось чаму сэрца маё так баліць,
Вось чаму хочацца к сонейку яснаму—
Хоць-бы убачыць, тым цягасьць зваліць!

Цяжка мне, праўда. Ці-ж трэба мне жаліцца?
Цяжка-ж другім—іх мільёны усіх,—
Жыцьце іх рушыцца, б'ецца і валіцца,
Гінуць надзеі і думкі у іх.

Многа на сьвеце усякага творыцца!
Многа хто вершаў аб гэтым злажыў.
Часам паслухаеш, хто разгаворыцца,
Бог яго ведае, як яшчэ жыў?!

Біўся з няпраўдай, з бядой і гаротаю,
Сэрца у попел няшчадна спаліў,
Сілы ўсе страціў у бойцы з цямнотаю,
Кроў, не рахуючы, кроў сваю ліў!

Што-ж тады плакаці мне, маладзейшаму?
Я-ж не прайшоўшы пуціну сваю:
Сэрца асталася. Не, весялейшаму
Трэба мне быць, а я плачу—пяю.

23.

З ПЕСЬНЯЎ НЯВОЛІ.

Я. Лёсіку-

Праўду мусім ведаць, браце:
Покуль мы ня ў роднай хаце,
Не на ніве покуль роднай,—
Нашай думачцы ніводнай
Век ня спраўдзіцца, ня збыцца,—
Мусім ў цеснай клетцы біцца
Нашых думак і жаданьняў
І няволі наляганьняў.

У гароце, у няволі,
Без пасьпеху, а паволі
Нешта розум ў нас вымае,
Смокча душу—выпівае
І за шыю душыць больна,
Што часамі мімавольна
З болю гэтага заплачаш,
Што аж слонейка ня бачыш!

Мусім ведаць, што мялеем,
Што паволі ўсё малеем,
Ня жывем, але канаем,—
Зранку долы вымяраем
І надзею што-дзень губім,
Хоць яе, як жыцьце, любім.

Нашы брацьця—там, на волі,
Паляглі, моў-ся на полі,
Чыстым полі ваявецкім,

Велькім колам маладзецкім,
З пасячонымі плячыма,
З выпалёнымі вачыма.

——

Мы зьявілісь з яснай казкі,
Братняй міласьці і ласкі,
З краю-Далі, краю-Сьвета,
Дзе цяплюхна, вечна лета,—
А нас кінулі у пушчы,
Ды у холад, дый у гушчы,
Дзе брат з братам вечна б'юцца:
Спруцянелі, а дзяруцца.

Мы хацелі даць ім сьвету,
Зруйнаваці пушчу гэту,
Даць ім міласьці прагненьне,
Дзён шчасьлівых даці меньне...
Мы ішлі вялікім валам,
Войскам буйным а зухвалым,
Ды ня стала нашай мочы:
Сьвет слабейшы быў ад ночы...

——

Што-ж? Няхай! Няхай так будзе.
Мусіць гэтак доля судзе.
Цяжка, страшна жыці, праўда,
Дык цярпеці-ж нам ня наўда.
Так на моры-акіяне
Часам хваля перастане...
Можа-ж прыйдзе навальніца,
Толькі-б ветрыку зьявіцца!

Будзем ў неба цікавацца,
Будзем зорак прыглядацца;
Без пакоры у пакоры
Перабудзем сваё гора.
Мо‘ і нам аднекуль з неба
Скажуць: „Чуйце, ўстаньце, трэба!“
І ўзмацняць. Парвуцца путы,—
Будзе вольны, хто закуты.

Не адны, а з грамадою,
Разам з людзьмі, чарадою
Пойдзем поплеч зноў у далі,
Скуль прыйшлі і скуль паўсталі.
А калі-ж ня хопіць сілы
Ўстаць на гэты вокліч мілы,—
Сэрца хоць мацней заб‘ецца,
Твар пахмуры усьміхнецца.

Можа-ж быць—раней загінем,
Дык усё-ж мы сьлед пакінем,
Бо, браток, хоць промень сьвету
Прынясьлі мы ў пушчу гэту!

24.

* * *

Вечнай памяці Т. Г. Шаўчэнка.

За тысячу вёрст ад радзімага краю,
У стэпу, пустэчы бязьлюднай,
Сумуець казак па загубленым раю,
Па маці-Украіне цуднай.

Няма яму волі, пад вартаю пільнай
Начуе, і днюе, і ходзіць,
Ніводнай ня мае людзіны прыхільнай,
Самотна дзянёчкі праводзіць.

А думка, як віхар, імчыцца, нясецца
Ад берагу мора Аралу
На родну старонку, дзе вораг сьмяецца
І ўсіх абдзірае памалу.

Ў душы яго ласка, каханьне малююць
Пакутніцы вобраз бяз сказы.
Ах, мучаць Украйну, рабуюць, ганьбуюць!..
Імчацца, нясуцца абразы:

„Вее вецер, сонца грэе
На стэпу шырокім,
Што відаць здалёк, чарнее
Дзе курган высокі?
Сьляпы гэнам на бандуры
Перабэньдзя грае,
Аб казацтве, аб гэтманстве
Сам сабе сьпявае:

—„Ой лунала наша слава,
Аж у звоны білі!
Меч гэтманскі і булава
К каралям хадзілі.
Мелі славу, мелі долю,
А цяпер прапала;
Мелі шчасьце, мелі волю,
А цяпер ня стала.
Стогнуць, плачуць стэп і людзі
Пад чужой рукою.
Вораг цёмны ўсьсеў на грудзі,
Не даець спакою.
Дзе, Багдане, слаўны Хмелю,
Дзе ты? Адгукніся!
За народ наш, за Ўкраіну,
Браце, заступіся!“
Сонца грэе, вецер вее,
Па стэпу разносіць
Тыя словы залатыя,—
Да касцоў даносіць.

Ўчулі людзі праўды слова,—
Засьпявалі ціха
Аб тым зьдзеку-паняверцы,
Панаваньні ліха.

Пан аконам—бочка піва—,
Цівуны у злосьці:
„Нуж-ма, хлопцы, жыва, жыва!
Бо зьдзяром да косьці!“

Сорам, сорам! Люд пакорны
Галавой схіліўся.

Пане, пане,—гадзе чорны,
Каб ты з сьвету збыўся!..

Адна за аднэю праносяцца зьявы,
Мігцяцца бясспынна абразы,—
Нявольнічы побыт і сьлёзы крывавы
І зьдзек глузаваньня, уразы.

Туды да няшчасных у думцы сягае
Пясьняр гэніяльны прыгону,
І богу на небе любіць прысягае
Народ свой,—любіці да скону.

25.

* * *

Эх, сягоньня, ў гэту ночку
Я ўцяку адгэтуль проч!
Шэрым воўкам па лясочку,—
Хай дагоніць, хто ахвоч!

Хай тагды сярод дарогі
Станець хто—ня будзе рад:
Чорны вуж абкруціць ногі,—
Буду вужам, буду гад!

Хай тагды шукаюць ў лесе
Цёмных, вузкіх, воўчых троп!
Як арол у паднябесьсе,
Я ўзьлячу над земскі строп.

Ў небе роўным, чыстым шляхам,
Яснай зоркай палячу
І скачуся па-над дахам
Роднай вёскі і ўскрычу:

— Гэй, хто ёсьць тут! Люд галодны,
Люд пакутны! Да мяне!
Станьма, брацьця, ў шых паходны—
Наша гора праміне.

Досыць нам з нядолі віці
Ценкі жыцьця свайго пас.
Слухай, люд: прынёс я віці,
Хто за мною, брацьця?—Час!

Ўстануць, рушаць: „Проч з дарогі!
Хто нам хоча заступіць?
Мы пайшлі, мы, люд убогі,
Ўсё узяць, ці ўсё згубіць“...

Думкі, думкі-звадыяшкі,
Ах, ня мучайце мяне!
Вам ўсё гульні, а мне цяжка,
Мне няволя ня міне....

26.

НА СЬМЕРЦЬ.

Памёр ты, татачка, ўспакоіўся на векі!
На вочы сумныя насунуліся векі,—
Прыціснула іх сьмерць мацней за чужынца.
І вот айца
Ня стала, родны мой, ад сьмерці тваяе...

О сьмерць бяз літасьці, ратунак ты і кара!
На што-ж яму, як тая чорна хмара,
Заслонай вечнаю ты стала прад вачмі?
Скажы, сьлязьмі
На што пасквапілась радзіны ты мае?

Ах, родны, блізкі мой! Гаротны і бяздольны,
Жыцьцё сваё, той шлях няўдатны і нявольны,
Ты з больлю цяжкаю у сэрцы перабыў
І свой згубіў
Апошні стон, адзін, ў чужацтве, у цішы.

Бясшчасны тата мой! Усім адна дарога...
І торганьня разлукі ня так катуюць строга,
Як тое, любы мой, што ў ноч, ў апошню ноч,
Ў цябе із воч
Сьляза скацілася аб скрыўджанай душы.

Дратуе сэрца мне, цьвікі ў мазгі ўбівае,
З грудзей і боль і стоны здабывае
Здагадка страшная: ў гадзіну ўсіх гадзін
Ты там адзін,
Маўляў бясплеменьнік, усім чужы, сканаў...

Адно бліжэйшае, адно-б хаця стварэньне,
Хаця-б народнае, хаця-бы на здарэньне,
Прасіў вялікага к табе хутчэй паслаць,
Каб з ім аддаць
Сваім апошні свой, гарачы свой прывет.

Ня меў ён літасьці, ня даў табе спакою,
Ў самоце, ў больніцы, жалезнаю рукою
Ён сэрца кволага спыніў нятрвалы рух
І бедны дух
Прымусіў твой пакінуць гэты сьвет

Казаў: „маліся“ ты. За што-ж, каму маліцца?
Ці-ж можна праўду нам знайсьці, калі маніцца,
У неба чорнае ўляпіўшыся вачмі?
З журбой, з сьлязьмі
Нясьці туды сваю найбольшую з надзей?

Пабач, гаротны мой: ці-ж ты ня моцна верыў?
Сьвятою праўдаю ці-ж кожан шаг ня мерыў?
Сьлязьмі крывавымі ня плакаў? Не прасіў?
Ня ўсё знасіў,
Запомнены праз неба, нязнаны праз людзей?

Ці-ж меў ты, родны мой, хоць дзень на адпачынак?
З гароты, з беднасьці ці знаў перапачынак
За веру гэтую? Ці-ж не балеў ты заўсягды,
Ня сох з бяды
З душою прэснаю, адкрытаю да ўсіх?

Салодкіх мала хвіль, а горкіх натт‘ багата
Памеў за жыцьце ты, мой родны, бедны тата.
А можа горкую табе і я хвілінку даў,
Не спагадаў
Табе калі?... Цяпяр за гэта выбачай.

Няхай пуховаю табе зямелька будзе,
Няхай спакой табе твой пан прысудзе.
Я некалі прыду пад той убогі крыж,
Дзе ты ляжыш,
І там наплачуся. А покуль што—прашчай!

27.

* * *

Думкі-дыямэнты, краскі жыцьця,
Песьні—вас тэтак люблю!
З вамі салодкіх гадзін забыцьця
Часам і я пазнаю.

Жыцьце-няволя ў чужой старане,
Працы надмернай яром
Зараз зьнікаюць, бы ў госьці ка мне
Вы паказаліся ў дом.

Слухайце-ж, думкі: як прыйдзе мой скон,
Ў хатку зьляціце ка мне,—
Хай перадсьмертны уцішыцца стон,
Сэрца на момант спачне.

Хай засьпяваю, як лебедзь, калі
Прыйдзе гадзіна яму,—
Ўзьнёсшыся ў неба ад маці-зямлі,
Рыне ў адвечную цьму;

Хай засьпяваю аб сьне залатым,
Веку людзкога радзтва,
Роўнасьці, вольнасьці, брацтва,—аб тым
Веку красы, хараства.

Можа, пачуўшы прадзгонны мой сьпеў,
Сьціхла-б на сьвеце вайна...
З радасным духам-бы я паляцеў
Ў царства каханьня, відна.

28.

ВЯСНА.

Эх, вясна, вясна!..
Як прышла яна,
Прынясла сьвятла,
Прынясла цяпла.
Наліла ў лагох
Сьнегавой вады,
Расьцьвіла ў лугох,
Распляла сады.
Прабудзіўся лес
На вясеньні шум,
А глыбокі сум
Мне ў душу улез...

Першыя гусі ужо праляцелі,
Палі на рэчцы, узгорак абселі;
Гвагалі доўга, нараду сабраўшы,
Потым згадзіліся, дось пакрычаўшы;
Ўзьляцелі высока над сосны, над елі
І недзе прапалі ў нябескім касьцеле...

Ах, каб крыльля, крыльля мне
І той лёт гусачы,
Я прапаў-бы ў гарыне
Хто-б мяне і бачыў!
Раз-у-пораз, раз-у-раз,
Ў неба-б біў крыламі...
Гусі, гусі, я да вас,
Я лячу за вамі!

Дзе былі вы? Што было там?
Дзе жылі вы? Над балотам?
Мо‘ ля рэчкі? Мо‘ ля хаткі?
Ля сялібы майго таткі?
Мае маткі, майго браткі,
Вы ня бачылі часамі?
А сястрыцы? А дзявіцы,
Маёй любы,
Вы ня бачылі часамі?
А у шлюбы
Ня зьбіраецца сястрыца?
Не? А люба, чараўніца?...
Ці там ймгліста,
Ці там ясна?
Красна? Міла?
Гусі! Шчасна?...

29.

NOCTURNO.

Спаткаў сягоньня я сваю Нядолю,
Знайшоў яе у сіненькім ляску.
Брадзіў бяз мэты я, душа гарэла з болю,
І думаў: будзе мне лягчэй у халадку.

Спаткаў, пазнаў яе і, вось, пытаю:
—Скажы ты мне, Нядоленька мая:
Багата жыцьця кніг яшчэ перачытаю?
Калі і на якой чытаньне скончу я?

Скажы, ня крыйся мне, мая камратка,
Дзянькі мае маркотныя чаму?
Адзін ў адзін ідуць, ва ўсіх адна апратка,
Як душы грэшныя, ці вінныя каму.

Чаму, яшчэ скажы, мая ядына,
Люблю зямлю, вялікі жыцьця ток,
Як неба зорачкі, каханьнем моцным сына,
А сам—адлучаны ад дзераўца лісток?

Яна у вочы люба мне зірнула,
Ўзлажыла белы ручанькі на мне,
Маўляў сястра мая, да сэрца прыгарнула,—
Часамі так цябе каханка прыгарне.

— Чакай, харошы мой, пакінь задумы!
Душу сваю пытаньнямі ня муч.
Зірні на гэты лес, прыслухайся у шумы,
А можа знойдзеш ты жыцьцёвы вечны ключ!

Стаіць магутны лес ізноў убраны
Ў зялёны ліст дагледлівай рукой,
І п'ець спажыўны клёк, старыя гоіць раны...
Зірні, якая моц! Зірні, які спакой!

Што-год ўміраець ён парой асеньняй,
Каб зноў аджыць, убачыўшы вясну.
І гэтак ўсё ідзець чаргою пераменнай;
То скіне сон з вачэй, то зноў ідзець да сну.

Расьцець дубочак тут,—які зялёны!
Другі стары калодаю палёг;
І сын ідзець ўгару, як бацька ў час мінёны,
Што даў жыцьцё яму, а сам звaліўся ў мох.

Цячэць ручайка вось, і ту-ж ня стала!
Няма яго, схаваўся у зямлі,
А недзе тамака рака зямлю прарвала,
І воды тэй ракі па лузе пацяклі.

І ты, о любы мой! Як лес зімовы
Заснуў, ляжыш, ня можучы устаць.
Але наступіць дзень вясёлы, пекны, новы,
І радасьць вольнасьці павінна завітаць.

Дзянькоў маркотнасьць ты сваіх ў распачы
тэй сваёй адлюднасьці ня гудзь:
Пакуту рок табе шчасьліваму прызначыў,
І ўдзячным за яе вялікаму ты будзь.

Няма пакуты дзе—няма пазнаньня,
Душа тагды лагчынамі паўзець;
А што гарчэй, скажы, цяжэй перапаўзаньня?
А што страшней яшчэ, як вочмі не глядзець?

Аб сьмерць пытаеш ты? Калі сканчыцца
Жыцьцё тваё,—міленькі, ня пытай!
Спрабуй ад думак тых, ад хворых, палячыцца,
Прыходзь у гэты лес—паветра тут глытай.

Жыві, каб жыцьце даць другім, малодшым,
Як дуб стары, што ўзгадаваў дубка.
А там... ручайка зьнік! І мы пуцём каротшым
Пайдзем ў зямлю за ім, каб выплысьць, як рака.

30.

* * *

Дзяўчыначка-сэрца, сябе ня трывож,
Ня песьці надзеі і жалю ня множ.
З табою пабрацца мне волі няма,—
Даўно заручыўся я ўжо са трыма:

Айчызна,—я ёй у няволі жыву,
Што-ноч яе бачу, маўляў на яву,
За ёю сумую, журуся адно,
Бо шчырым каханьнем зьвязаўся даўно.

Другая—матуля. Радзіўся калі
І голас мой першы падаў на зямлі,
Замучаны твар усьміхнуўся яе:
„Сыночак мой любы!“—вітала мяне.

Аб трэцьцяй, дзяўчынка, скажу, што яна—
Другоі ня знойдзеш—на сьвеце адна;
За краты няволі паслала: „люблю“,
Дык хіба-ж з табою яе падзялю?

Пакінь-жа, галубка, з каханьнем сваім!
Шукай сабе шчасьця за кім за другім;
Пяшчоты, залёты ня траць задарма,—
Даўно заручыўся я ўжо са трыма.

31.

МАЯ ЛЮБА.

У любы маёі дый косы ільняныя й вочкі нябескія,
Губкі вышнёвыя;
І шчочкі ружовыя, шыйка і ручкі, як бель лебядзіная,
Грудкі пуховыя;
І голас у любай, як ў лесе зьвінючай, бліскучай крынічанькі
Сьпевы адвечныя;
А ўсьмешка каханай—ў зялёным аксаміце луга мурожнага
Пэрлы сланэчныя.
Ідзець каралеўнаю, добрай, ласкаваю, роўнай паходкаю,
Ціха ступаючы;
Заўсёды ўсьміхаецца думцы захованай, ў сэрцы мілосную
Песьню сьпяваючы.
Вяночкі што-вечару ў рэчку спушчаючы, кажа: „Плывіце вы
Разам з вадзіцаю!
Скажыце каханаму—станем прад богам мы параю шлюбнаю,
Хоць-бы з грамніцамі".

А гэтак далёкая! Так яно, зорачка захаду раньняя,
Будзе і станецца.
Над нашым каханьнейкам людзі ня сільныя, леты ня ўласныя,—
Хай-жа мінаюцца.

32

* * *

Хто сказаў: „і я з народам“,
Хто з ім поплеч стаў, як з братам,
Хто пайшоў з ім роўным ходам,
К роўным зыскам, к роўным стратам,—
З тым і я. Няхай-жа ліча,
Будзе трэба—хай пакліча.

Хто-ж сказаў, а потым здрадзіў,
Хто пайшоў, а потым кінуў,
Хто ў душы сумленьне згладзіў,
Ў кім апошні сорам згінуў, —
Хай дрыжыць! У дзень прысуду,
Ў страшны дзень, я сьведчыць буду!

33.

ІДУЦЬ ГАДЫ.

Ідуць сабе гады, ідуць,
Бы карагод бяз конца,
Што ў небе зорачкі вядуць
Ля месяцу, ля сонца.
Ідуць сабе гады, ідуць —
І чалавек за імі.
Куды цябе яны вядуць
І сьцежкамі якімі?

—„Няведама мне, скуль усе і што я;
Няведама мне сама сьцежка мая,
Няведама мне, і куды я іду,
Пытаньня ня маю, ці што там знайду;
Ня ведаю, жыцьце ці шчасьце, ці не, —
Пачалася гэта, браток, не на мне".

Ідуць гады, ідуць гады —
І з імі ўсё на сьвеце.
Сягоньня ты, а йшлі дзяды,
А заўтра пойдуць дзеці.
Ідуць гады, і ты ідзеш
Ўздагонь за імі, з імі.
Нашто, скажы мне, ты жывеш
І з думкамі якімі?

— „З аднэю я думкай у сьвеце жыву,
Настаўнікам ўзяўшы і лес і траву,
Крыніцы і кветкі, і цемру і сьвет,
І месяц і зоры, і сонца прывет.
Прысуджаны шлях свой рабі дарагім,
Красуйся на радасьць сабе і другім".

34.

НАВУКА.

Казаў настаўнік мне (ён блізкі быў прароку,
Які жывым узьняўся ў выш, ў блакіт нябескіх сфэр):
„Мой сын, спачатку мы пад'ўладны пану-року —
У гэта вер.
Які-бы крыж табе ня выпаў ў жыцьці гэтым:
Галеці век чы быць царом і царскі мець пасад,
У балоце бросьнеці чы йсьці к нязнаным мэтам, —
Яго загад.
І вось, калі табе трываць ня хопіць змогі,
І цяжкім здасца крыж табе, і доля вельмі злой'
Ня трэба, сын, шукаць лягчэйшае дарогі, —
Ідзі старой.
І мусіць час настаць: убачыш сьвет праменны, —
Ідзець ўладар адвечны твой; яго спаткай здалёк,
Узьдзеўшы бітвы меч на свой паяс раменны.
І скажа рок:
„Ідзі хутчэй, слуга! Спавіты сьвет маркотай,
Ў ім крыўды легіон забраў зямлі апошню чвэрць,—
Нясі-ж свой праўдзе меч".—Мой сын! ідзі з ахвотай
На чэсьць і сьмерць".

35.

АДБІТАК.

Дзіўлюся я на зьяньне ясных зораў, —
І сумна-сумна так, што я ня разам з імі,
Што жыць ня лёс мне ў вышыне нагорнай
І сьцежкамі хадзіць па небе залатымі.

Сярод нязнаных мне, нябачаных прастораў,
Раўнінай той, што зьвецца Бесканечнасьць,
Я лётаў думкаю-б і воляй непакорнай
І можа-б там пазнаў цябе, Адвечнасьць.

Дзіўлюся я на зораў ясных зьяньне,
На сьцежкі іх, ўсё тыя-ж, як прад векам,
І сумна гэтак мне, і родзіць сум пытаньне:
На што пачаўся я ад бога—чалавекам?

36

* * *

Як ліст вярбінкі маладой,
Што вецер злосны адарваў
І кінуў ў рэчку і з вадой
У даль няведаму пагнаў, —
Плыву сабе. Рака мая—жыцьцё,
Па ёй плывуць і кветкі і сьмяцьцё.

Я раз спытаўся у вады:
— Скажы, адкуль ты прыцякла?
Яна сказала:—З-пад грады
Каменных гораў уцякла.
— Куды-ж бяжыш?—Цяпер бягу над спад
У мора я.—А вернешся назад?

— Над мной закон—колазварот.
Плыву я з мора ў акіян
І стуль зьбіраюсь ў паварот,
Калі узьнімецца туман,
І ўзьляжа ноч. Лячу хутчэй тагды—
Цячы ракой з-пад горнае грады.

Як ліст вярбінкі маладой,
Што вецер злосны адарваў,
І я плыву сваёй ракой,
Жыцьцём якую хтось назваў.
Нясець яна і кветкі і сьмяцьцё...
А ты-ж скажы, ці вернешся, жыцьцё?

37.

НЯЗНАНЫ ГОСЬЦЬ.

Дзіцятка малое у жыцьце прыйшло.
Спытаўся яго я:—А дзе-ж ты было?
Скажы мне, пісклятка, ў якіх гарадох?
Скажы мне, дзіцятка, ў далёкіх краёх?
Скажы, анялятка, ці доўга блукаў?
Скажы мне, ягнятка, каго ты спаткаў?
Скажы мне, малое, ці быў ты ў раю?
Скажы, залатое, ці долю сваю
Ў эдэме убачыў, спаткаў, палюбіў?
Ці што, неабачны, благога зрабіў?
Напрыкрыўся ў небе? Ці сум сустрачаў
Па іншаму жыцьцю, што гэтта пачаў?
Скажы мне, малое! Хачу я пазнаць,
А дай, залатое, цікавасьць спагнаць.

І ціхай задумы заслона зыйшла
З спакойнага твару, і хмарка найшла;
З блакітненькіх вочак, што з неба прынёс,
Скаціліся сьлёзкі,—дзьве пэрлінкі сьлёз.
Аб чым яно плача? аб райскіх садох?
Аб кветках праменных? анельскіх сьпявох?
Аб чыстасьці, яснасьці, сьвятасьці душ?
Тварца маестатнасьці? Дзеткі, чаму-ж?
Аб чым ты заплакала?—Мне у адказ
Скаціліся новых дзьве пэрлінкі ўраз.

38.

МАТЧЫН ДАР.

Як радзіла маці мяне ў цёмну ночку,
Дык дала скрыпіцу: „На, іграй, сыночку!
Грай сабе на шчасьце, грай на добру долю,
Грай на век даўгуткі, грай на вольну волю".

Помню, дзіцянёткам з тугай я ня знаўся,
Жыў, як тая птушка, граў і забаўляўся;
Дзень мне быў спакойны, ўночы сон бязгрэшны,
А цяпер застаўся я на век няўцешны.

Ой, чаму-ж, матуля, жыцьце-скрыпку дала,
Як-жа шанаваці, дый не навучала?
Гэта-ж падзівіся—я адкрыцца мушу,
Што сапсуў скрыпіцу, што згубіў я душу.

Здаўна, сівакрыла, шчасьця я ня маю,
Долі я ня бачу, радасьці ня знаю.
Граю, праўда, граю!... А на сэрцы важка,
А у сэрцы больна, аж трываці цяжка.

Тыя ня прыходзяць песьні-весялушкі,
Як пяе зямліца, як шчабечуць птушкі.
Жаль з нудой заплачуць, глуха як зайграю...
Маю я скрыпіцу, а душы—ня маю!

39.

ЗМОРА.

М. В.

Сэрца, спаць хачу я, спаць!
Заўтра рана ўстаць мне, ўстаць.
Вочы сьлепіць сон мне, сон,
Ў вуха шэпча ён мне, ён:
—Ня журыся, палажыся, адпачні.
Мардаваньне, сумаваньне адгані.

—Заўтра зрана, сьвет-ні-сьвет,
Выйдзеш з хаты з гэтай, з гэтт.
Стаць на працу мусіш, стаць.
Здаць прыгоны мусіш, здаць.
Не мардуйся, не крапуйся, адпачні,
Думаваньне, сумаваньне адгані!

Рыбка, спаць хачу я, спаць!

40.

ЛІТАНЬНЕ АДЗІНОЦЕ.

Зноў я прыходжу у часе зьмярканьня,
Складаю літаньне, нясу табе даньне
Ад сэрца свайго, Адзінота.

Можа раней, як яшчэ не радзіўся,
Табе быў адданы, табе прысудзіўся,
Крулёва мая, Адзінота;

Можа быць маці, калі спавівала
І ночы ня спала, над люлькай сьпявала,
Аддала табе, Адзінота.

Меў я ад родных пяшчоты-упады,
Мне мамка-галубка і ўсе былі рады,
А ты—над усіх, Адзінота.

Ты надавала мне брэдняў ў садочку
Ля хаткі радзімай, ў вішнёвым куточку,
Дзіцяці яшчэ, Адзінота;

Ласка твая, што ўсяго навучыўся,
Ў жыцьцё, і ў людзей, і ў цябе улюбіўся,
І воля твая, Адзінота.

Сьмерцю сваёю ці наглаю згіну,
Ніколі цябе я ужо не пакіну,—
Ня здолеці мне, Адзінота!

Часам табе пасылаю праклёны,
Зубоў скрыгітаньне, уразаў мільёны
Ўладаньню твайму, Адзінота;

Й дух непакоры, руіны, паўстаньня,
Над ўсё пераможны, кідае ў растаньне,
Абы ад цябе, Адзінота!

Потым прыходжу пануры, пахілы,
Хачу падзівіцца на вобраз твой мілы,
Пякнейшы за ўсё, Адзіпота.

Ты-ж, як матуля, прытуліш і прымеш,
Ашушкаеш ласкай і тугу сунімеш,
І зноў я з табой, Адзінота!

Гэтак, нявольны ніколі сабою,
Прыходжу сягоньня па спрэчцы з табою
Ў пакоры.— Прыймі, Адзінота!

41.

НАЧЛЕГ.

Сьпіць душа, і розум сьпіць
Смачна, бяз трывогі,
Піць і есьці, есьць і піць —
Клопат ўвесь нямногі.

Лёгка так. Ня маеш дум...
Ў прочках дзесь маркота...
Боль прайшоў, уняўся сум,—
Спаць адно ахвота.

Сьпіць душа... і розум сьпіць!
Часам нехта ўзбудзіць,—
Нібы ўстыдзіць, нібы кпіць,
Нібы крышку судзіць:

„Сорам, брат"... А далей слоў
Я праз сон ня чую.
Зьнікне голас, ціха зноў...
Ў ясны дзень—начую.

42.

* * *

Скажы, братухна, калі параньне?
Калі сьвітаці пачнець у нас?
Праймчыцца ночка, і сонца ўстане,
І дасьць вясельле, і дасьць пакрас?

Скажы, братухна, калі прачнуся
Ад тэй навалы, ад тэй жуды,
І з ветрам буйным гуляць пушчуся —
На сьвет, на людзі ці хоць куды?

А можа, браце, і сонца ўстала?
І льлець праменьні на лес, стэпы?
Ды так глыбока душа запала,
Што я нявісны, што я сьляпы?

43.

Н О Ч.

Ў гэту ноч мне ня ў моч—
Няма сілы чакаць і маліцца...
Каб я ўмеў, каб я сьмеў
Узьляцець-паляцець ці разьбіцца!

Як сакол, як арол,
Я падняўся-б высока страшэньне;
Я-б узяў, я-б украў
І сабе і усім адпушчэньне.

Калі-ж не, калі-б мне
Адпушчэньня на небе ня далі,
Я-б маліў, я-б прасіў,
Каб і крыльля мае паламалі.

І тагды, наўсягды
Папрашчаўшыся-б з небам, з зямлёю,
З гарыні, з вышыні
Паляцеў-бы за сьмерцю сваёю.

Але-ж не, то ня мне
От такая вялікая доля:
Узьляцець-паляцець
Ці упасьці разьбітым на поле.

Ня пры нас сьвяты час
Вызваленьня людзкога настане,—
Мо‘ праз век чалавек
Да вялікага жыцьця устане.

Без бяды, бяз жуды
Будзе жыць-панаваць, весяліцца;
А для нас—цяжкі час —
І чакаць, і цярпець, і маліцца...

44.

*
* *

З Б-ку

„Хрыстос нарадзіўся! Хрыстос нарадзіўся!“
Сьпяваюць у небе анелі:
„Збавіцель для сьвету на сьвеце зьявіўся,
Збавіцель, якога ня мелі!“

„Хрыстос нарадзіўся!“ Каб гэтая праўда
Зьісьцілася, браце, сягоньня...
Каб ўстала на сьвеце вялікая праўда,
Што крыўду у цемры прагоне.

„Хрыстос нарадзіўся!“ Ці-ж мала мы чулі
Такую з нябёс абяцанку?
А вочы свае ледзь ад сну разамкнулі,—
Няма і ня відна паранку!

„Хрыстос нарадзіўся!“ А дзе-ж яго знакі?
Цяпер я Тамаш і ня веру.
Здаецца мне сьвет, як і быў, адзінакі,
А ў ім лютаваньне над меру.

„Хрыстос нарадзіўся!“ Не, хіба што будзе
Яго нараджэньне. Мы знаем,
Яго дачакаюцца іншыя людзі,—
Ня мы дачакаем.

45.

МАЛІТВА.

Я бачыў: сын яго стаяў
На пушчы і маліўся,
І словы ў гневе прамаўляў,
А твар сьлязьмі абліўся.
—„Ах, дай мне, ойча, моцных слоў,
Маланак-слоў палючых,
Бо кроў мая сачыцца зноў
Із ранаў тых балючых...
Дзівіся, пане, слабы я,
Саўсім ня маю сілы;
Гарыць, баліць душа мая,—
О дай-жа моцы, мілы!
Паглянь: паўсюдах з краю ў край
Рабунак, глуз пануюць,
І льецца сьмех тых чорных зграй,
І ўсё з зямлёй раўнуюць.
Зірні: дзе пекнасьць тая, што
Надаў нам, міласьцівы?
Тваіх правоў трымае хто,
Братэрства, згоды хцівы?
Схініся к нам ты і абач:
З гадзінай горш жывецца,
Цяжэе боль, мацнее плач,
Галоў ўсё болі гнецца.
Паслухай ноччу, ў дзень, сьвяты,
Скажы маўчаці звонам,—
І колькі жальб пачуеш ты!
Зямля азьвецца стогнам...

Узглянь: навокал чорны сьвет,
Прыцьмена праўды сонца,
Надзеі ў людзях болей нет,—
Пашлі-ж ім абаронца!
Ах, дай мне, божа, гэткіх слоў,
Зямля-б ад іх траслася!
Баляць бо раны мае зноў,
І кроў з іх палілася...
Пашлю тады маланкі ў люд,
У бясчасны той, брадзіці,
Блішчэць, яскравець там і тут,
Праўдзівы гнеў будзіці.
Мільёны кіну пяруноў
У тых, каго я знаю,
У тых, маю што сочаць кроў,
У тую чорну зграю.
Тагды ізноў, як колькі раз
На сьвеце ўжо бывала,
Настане твой вялікі час,
Твая засьвеціць хвала.
Малюся-ж,—дай мне гэтых слоў!
Сцаліш мяне,—паможаш.
Гарыць душа, баліць ізноў...
Вялікі! дай, як можаш!“

46.

ПОЭТУ.

Што кажаш мне, поэт, а праўдзе тэй, што будзе?
Мне сэрца кроіцца ад крыўды нашых дзён!
Я бачу добра й сам: ідуць да праўды людзі,
Расьцець яе жаўнер, і шырыцца загон.

Марудна, братачка! І покуль сонца ўзыйдзе,
Дык вочы выесьць нам салоная раса,
І покуль першы дзень людзкога шчасьця прыйдзе,
Мільёны сэрц праткне гароты злой каса.

Пакінь, пакінь сьпяваць а праўдзе тэй, што ў небе!
Яна чужая нам, таемных праўда сіл;
Яна ня сходзіць к нам ў канечнае патрэбе,
Калі пакуты дзень так довяг і ня міл!

Прашу цябе, мой брат, сьпявай аб нашым горы,
Аб тым, што ёсьць цяпер і што даўней было,
І што на ўсякі твар кладзець, як плуг, разоры,
І што ў мільёнах душ разоры правяло.

Прашу цябе, сьпявай аб горы песьнь адну ты,
І наш гаротны лёс рабі яшчэ цяжэй;
Тады, убачыш сам, парвуцца духа путы,
І будзе ясны дзень да нас тагды бліжэй.

47.

СЛАБАСЬЦІ.

Няхай душы, каторай бог надаў любоў,
Праклёны—грэх,—аб гэтым буду знаць я!
Кляну цябе, кляну цябе ізноў і зноў,
І буду праклінаць я.

То-ж ты ка мне прыйшла, як волю адабраў
Тыран маю, скуў цела ланцугамі,
І думкі вольныя з душы павыдзіраў
І растаптаў нагамі!

То-ж ты прыйшла тагды і стала ля вакна
І ў вочы мне зірнула цераз краты,
Ты, подлая, ніхто, як ты адна,—
Ты будзь праклята!

То-ж ты мяне, як маці, моцна абняла,
Сьлязой спачуцьця бледны твар абліла;
Што хвіля ясных зор, сьвятых ахвяр прайшла,—
Ты гэта гаварыла!

То-ж ты казала мне, каб я, хаця на час,
Зьмірыўся-бы, пакуль тыран катуе,
А ён усё гняцець! Душыў ня толькі нас,—
На ўсіх лютуе!

То-ж ты шаптала мне: „успомні, што ты сын,
Пацеха старасьці“. Калола грудзі
Мне тым. А дзе закон:—„ідзі, свой дом пакінь
І родных людзі?“

То-ж ты аблутала душу ганебным сном,
І вось яна: гатовая магіла;
Замест жывой зямлі кладуць труну з мярцом...
То-ж ты зрабіла!

Пусьці-ж, абрыдлая, з тваіх ласкавых шпон!
Няхай памру, калі ня буду жыў я,
Абы мне споўніці сьвяты жыцьця закон,
Абы ня згінуў я!

48.

Ж Ы Ц Ь Ц Ё.

Жывець спакойна вол пад тым ярмом сваім,
Намуляў карк. Мазолі, скрозь мазолі!
Падкінуць сена жмут—яму й таго даволі,
І лёс мізэрны свой не назаве благім.

Цярпліва зносіць ён нявыгады жыцьця:
Няхай яго часамі злаюць ліха,
Хай сьвішча страшны біч,—пакорліва і ціха
Ідзе разораю. Кіруе ім дзіця.

Жыві-ж, спакойна, вол, хадзі ў сваім ярме,
Цягай плугі і лій свой пот на пана,
Хаця ня ведаеш, якая рэч пашана.
Нашто яна табе? Сьляпому добра ў цьме,
Лягчэй ісьці яму дарогаю жабрачай...

А ты—жывёлаў цар? Ці-ж ты жывеш іначай?!..

49.

МУЛЯРУ.

— Муляр, слухай! Што кладзеш ты?
— „Дол сьмяротны, бачыш,—склеп.
От, як скончу ўсё да рэшты,
Буду мець рубель на хлеб".

— Слухай, муляр: пакідай ты
Сьмерці сховы мураваць,—
Хай ня знаць іх! Уставай ты,
Пойдзем жыцьце будаваць.

Бачыш: людзі, як бяздомкі
Ходзяць скрозь бяз ўласных хат?
Я работнік спрытны, ёмкі,
Пойдзем муляр, пойдзем, брат!

Возьмем кельні, малаточкі,
Дзьве рыдлёўкі, вінкель, шнур,
Гукнем: „Людзі, галубочкі!
Хто ахвочы класьці мур?

Мур вялікі, вольнай волі,
Мур высокі да нябёс,
Мур братэрства, роўнай долі,
Мур для радасьці бяз сьлёз?"

От, убачыш, прыдуць людзі
На ўспамогу ў грамадзе;
Кожан цэглу класьці будзе...
От дзе праца загудзе!

Сьцены зробім чыста, гладка,
Як з крышталю, столь, як шкло,—
Скажуць людзі: „Вось дык хатка!
Роўнай ў сьвеце ня было!“

Будзем есьці ў гэнай хаце
Смачны, чысты, пульхны хлеб.
Пойдзем, муляр, пойдзем, браце,
Хай другі канчае склеп!

50-51.

ВЯСНА.

I.

Дзе дадуць—зраблю пазыку
І найму сабе музыку,—
Дудара з яго дудою,
Каб іграў ён моцна ёю.

Грайка, грай! я засьпяваю,
Што цяпер на сэрцы маю...
І дудар ужо іграе,
Маё сэрца так сьпявае:

„Прападзі мая жуда,
Ўсё, што церпіць небарак,
Ўсе нястаткі ды бяда,—
Я шчарнеў, глядзі, і так,

Толькі вус адзін бялявы...
Годзе мучыць! Я хачу
Сілы, працы, і забавы,
І вясельля у ваччу“...

А з чаго-ж я узбуяўся?
Бо вясна ідзець да нас:
Як убачыў,—засьмяяўся
І вясёлы стаў на час...

Грайка, грай! бо сэрца скача,
Яму трэба моцна граць;
А жуда няхай паплача,—
Час яе і забываць...

II.

... Вясна прыйшла!
Што чакалі, выглядалі,
Да сябе даўно гукалі,—
У бляску сонца, ў зеляніне,
У прыгожасьці, ў ярыне,
Сама-пекнасьць, сама-сьвята,
І прыгожа, і багата,
Да нас прыйшла!
Я вітаю
Яе ў сонцы, ў зеляніне,
Што на роднай на краіне
Гоніць бляскам сваім ноч,
Гоніць сьнег і хмары проч;
Яна радасьць мне і сьвята,
Ёй я дзякую багата
І вітаю!

52.

ВЕЦЕР.

Вее вецер вольны,
Хмары шыбка гоніць;
З вадой, зямлёй, лесам
Зюкае-гамоніць!

Прыляцеў да рэчкі,
Прылёг, прытуліўся,
Крышачку па яснай
Віхрам закруціўся;

Сказаў слоўца ласкі,
Сьвіснуў і падняўся,
І за хмаркай лёгкай
Пырхнуў і пагнаўся.

Зноў прымчаў да лесу:
„О, здароў, мой браце!“
І пайшоў між хвояк
Ён дурэць, гуляці:

Адну пацалуе,
З другой пасьмяецца,
Кіне слоўца, пару,
Да трэцяй бярэцца...

Годзе ўжо у лесе!
Зноў увыш падняўся,
Пакруціўся крыху
Ды удаль падаўся.

Задаў гону, пылу
І уніз ён рынуў,
Прыпаў да зямліцы,
Быццам дзесь загінуў.

„Ах, мая матуля,
Як я нагуляўся!
Бачыў сонца, месяц,
Ў рэчаццы скупаўся.

Хораша на сьвеце!
Колькі ў ім прастору:
Шыбаеш па рэчцы,
Прыпадзеш да бору...

Я хацеў-бы болей
Ў сьвеце пагуляці,—
Адпусьці-ж, матуля,
Яшчэ палятаці!“

Пэўне, што пусьціла
Вецер маць гуляці,
Бо падняўся ў неба
І пачаў сьпяваці...

Вось,—нянацкам скончыў
Сьпяваці гуляка,
Гікнуў і панёсься
Ўдаль хутчэй за птака.

53.

У ПРЫПАР.

Прыпарыла,
Нахмарыла
І ўдарыла!
—Сьвяты Ільля...
Маланка ўраз зьявілася,
Мільгнула і звалілася,
І дожджыкам аблілася
Гарачая зямля.
Кроплі разам, згодна, жвава,
Пояць ўсё, што хоча піць:
Збожжа, дрэвы, кветкі, травы;
Вулкі хочуць затапіць,
Б'юць у стрэхі, мыюць шыбы,
Мыюць хаты, мочаць сад;
Ў рэчцы спожыў маюць рыбы...
—Хто ў прыпар дажджу ня рад?
Сьцішаецца,
Зьмяншаецца,
Ўнімаецца.
— Няма!
І слонка паказалася,
Маўляў, само купалася;
Прыемна усьміхаецца,
Блішчыць, пераліваецца,
Яскрава адбіваецца
На траўцы, на лісточку,
У рэчцы, ў раўчачочку,

На вулачцы, ў садочку;
Зямля ўздыхае поўнымі,
Шчасьлівымі, чароўнымі
Грудзямі усіма.

54.

ДОБРЫЯ ДЗЕЦІ.

Паставілі дзеці сіло. Вераб'я
Хацелі злавіць на пацеху.
Злавілі сінічку, крычаць: вой-я-я!
А радасьці колькі, а сьмеху!

Імчацца да маткі:—„Сінічка, глядзі!"
— „А дзе-ж вы узялі?"—„Злавілі!
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі"...
— „Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!"

— „Мы будзем яе і паіць і карміць,
Сьпявала-б нам птушка прыгожа"...
— „Ах, дзеткі! ў няволі яна замаўчыць,
Сьпяваць у няволі ня можа...

Успомніце толькі, як нудна сядзець,
Як з хаты мароз ня пушчае.
То-ж дзень, вам здаецца, як тыдзень ідзець,
Хоць я і усяк разважаю.

А птушку вы хочаце з хаткі яе
Узяць, пасадзіць у чужую....
Ня мучце, пусьціце, рыбулькі мае,
На волю яе залатую".

І матчыны словы у сэрцах дзяцей
Ласкавыя струны кранулі,
І добрыя дзеці—прыклад для людзей!—
Сініцы свабоду вярнулі.

55.

САЛАВЕЙКА.

Салавейку узялі ды з гаю
Пасадзілі у клетку за краты.
У маю
Тэй страты
Найцяжэйшай дазнаў салаўюшка.

Распусьціўся лісток на дубочку,
Апранулась зямелька у краскі;
А ў ночку,
А з ласкі
Не сьпявае ніхто над рачушкай.

Ой чаму-ж, салавейка, ты болі
Чараўнічых сьпявоў ня счынаеш?
Што волі
Ня маеш
І сьпяваці ня будзеш ніколі?

56.

ДЗЯЎЧАЦІ.

Цябе спаткаў і сам ня знаю,
Ад сэрца шчырага кажу,
Якую, дзеўча, думку маю
І сьпеў аб тым які злажу.

Здаецца, нешта ўскаланула
Ў душы маёй ты неўзнарок,
Былога струны закранула,—
Зьвіняць ледзь чутна аддалёк.

Ці-ж будзе час, што нам спаткацца
Яшчэ раз здарыцца калі,
І струны сэрца разбрымяцца
У тыя песьні, што былі?

Ніхто ня скажа! Толькі знаю
І не ўтаюся ад цябе:
Няхай цябе я не спаткаю,—
Пакінеш сьлед ты па сабе.

І ў час, калі гадзінай шарай,
Сярод бязьлюдзьдзя, пустаты,
Нуда абляжаць чорнай хмарай,
Праменьнем сонца будзеш ты!

57.

АСЕНЬНІ СЬПЕУ.

Пойдзем, каханачка, двое
У лес у густы,
Ціхі, бо скончыў сваё панаванье:
Жоўкне, галее, мураўка ў ім вяне,
Чарнеюць кусты.

Пойдзем, галубка, пад дубам
Прысядзем, мая.
Гэнам убачым лістоў ападаньне,
Шэлест іх сумны пачуем, шаптаньне,
І звоны руч'я.

Будзем адны мы на сьвеце
З табою, адны
Тыя, што прыйдуць у часе скананьня
Беднаму лесу сказаць на жагнаньне:
— „Да новай вясны!"

58.

ПЕСЬНЯ.

Прыказала слонца ветру
Перастаці,
Прамаўляла: „Годзе, ветра,
Бусаваці".
Прамаўляла: „Дай жывёлам
Адпачынку,
Перастань-жа, ветра, дзьмуці
Бяз упынку".
І ўзыйшло ў бліскучай шаце
Залатое
І пястуець любым вокам
Ўсё жывое.
Не сядзіцца ветру ў хаце—
Быстраходу,
Ня уцерпеў, ўзьняўся бурай
Ад заходу.
Карагоды хмар па небе
Панясьліся,
Паліліся з неба сьлёзы,
Паліліся....

Прамаўляла дзеўча сэрцу-
Ненаглядзе:
„Не хадзі ты вішні есьці
Ў чужым садзе.
Не хадзі к другой, ў залёты
Не ўдавайся,

У другія вочкі, любы,
Не ўглядайся".
Лугавой лялеяй дзеўча
Расквітала,
Цалавала сваю ўцеху,
Мілавала.
А няверны той удаўся
За другою,—
З млынароўнай пахаджае
Над ракою.
З млынароўнай жарты строіць
Каля млына;
А дзяўчынка сохне, вяне,
Як галіна...

Ой, з-за хмарак ясна слонца
Йшчэ узыйдзе,
Да дзяўчынкі-ж любы ўвечар
Больш ня прыйдзе.

59.

ХАЎТУРЫ.

Ня у звоны хаўтурныя служка прабіў,
Як хаваў я дзяўчыну, катору любіў.
Не на могілкі людзі кахану нясьлі,
А у цэркву баяры яе павязьлі.
Не халоднай зямлёй засыпалась труна,
А другому любіць прысягалась яна.
Не пяшчаны над ёй вывадзілі капец,
А вясельныя дружкі трымалі вянец.
І ня плакала матка, што ўмерла дачка,—
Цалавала жанулька свайго мужанька.
Не асінавы кол я над ёй забіваў,
А старэнькі дзячок доўгалецьце сьпяваў.

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

60.

МЯЦЕЛІЦА.

Ой, спаліце, пяруны,
Майго Янку, бо дурны!
Назаляе толькі мне,
А каб сватацца, дык не!

Я казала, дый ня раз:
„Прысылай сватоў да нас;
Татка добры, ён аддасьць,
У пасаг цялушку дасьць“.

А той Янка, той благі,
Усё сьмяецца—„гі-гі-гі“.
Да таго-ж часамі кпіць:
„Ну, чаго табе карціць?“

Ой, пралійцеся дажджы,
А ты, Яначка, пажджы:
Учыню табе бяду,—
За нікога не пайду!

61.

ДВА КАХАНЬНІ.

У аднэй Марылі, маладой дзяўчыны,
Быў каханак Яська, вагнявы хлапчына.
Што ні вечар прыйдзе, што ні ночка стане,
А ў іх у садочку аб адным шаптаньне:
„Да душы,—Марыля свайму Яську кажа,—
Хіба сьмерць бяз часу нас з табой разьвяжа".
—„Не кажы няпраўды,—малайчына вучыць,—
Нас ні бог, ні людзі і ні сьмерць разлучыць".
І сядзяць і шэпчуць да зары-сьвітаньня;
Былі вішні ў садзе сьведкі мілаваньня...
А настаў дзянёчак—да Марылі ў сваты
Прыляцеў панічык, шляхцючок багаты;
І дзявочча сэрца—ах, слабое, знана!—
Перайшло ад Яся да другога пана.
Хіба-ж Ясь заплакаў?—Не з таго дзесятку!
Пакахаў другую, пакахаў Агатку.
І цяпер, як цемязь западзе над вёскай,
Ён сядзіць з Агаткай пад старой бярозкай;
Пралятаюць змрокі неўсьцярэжна хутка,
І ўся ноч здаецца, як адна мінутка.

А жыла-ж Антоля,—мусіць мела долю,
Ды згубіла долю ў шырокаму полю.
Мела двух прыгожых, мела двух каханкаў,
І адзін быў Янка, і другі быў Янка.
(Дзьве душы няродных ў адным целе жылі,
І дзяўчыну кожан паасоб любілі).
Адзін з шчырым сэрцам, а другі з няверным,

Надарылі дзеўку жалем непамерным.
Як адзін цалуе, ненагляду песьціць,
Дык другі мяркуе, як-бы абясчэсьціць.
Як адзін ў садочку з любай пахаджае,
То другі у прочкі ў думцы ад'яжджае.
Як адзін бажыўся, абяцаў жаніцца,
То другі у лыжцы жычыў утапіцца.
І ў канцы ся стала, чаму была стаці:
Прычытала маці над дачкой у хаці:
„Ах, мая дачушка! А мая-ж рыбулька,
А мая-ж ты птушка, а мая-ж зязюлька!
А чаму-ж ты, доню, губкі сашчаміла?
А чаму-ж ты, дзеткі, вочанькі закрыла?
А чаму, дачухна, міла ня ўсьміхнешся?
А чаму, красухна, мне не адгукнешся?
Што-ж табе ня добра, што-ж было ня міла?
Ці-ж тваю галоўку не сама я мыла?
Ці-ж тваю сарочку не сама я ткала?
Ці-ж тваёі сьмерткі я, скажы, чакала?"...
Так было з Антоляй, што ня мела долі,
Ці згубіла долю ў каласістым полі.
Як-жа тыя злыдні? Хоць адзін шкадуе?
Э! адзін часамі, а другі ганьбуе.
Як былі-ж абодва у ядыным целе,
Дык жаніўся Янка і згуляў вясельле.

62.

КАЗКА.

Што, дзяўчаткі, парабочкі,
Казку вам сказаці?
Ну, якую-ж проці ночкі
Лепі нагадаці?..

Добра!.. Слухайце уважна,
Не перабіваці!
Сядзьце чынам і паважна,
Кіньце блазнаваці!

— За ваконцам вецер сьвішча,
Як ваўчына вые.
Ведзьмы справілі ігрышча,
Ведзьмы маладыя.

Ў хаце цёмна, ціха, смутна,
Цяжка а тужліва;
Уздыхае хтось пакутна,
Неяк сіратліва.

Ўдовай бабкі сын прыгожы
Сеў каля ваконца,
Чымсь-ці хворы, спаць ня можа,
Выглядае сонца.

Ведзьмы скачуць і гуляюць,
Зірк ў вакно: хлапчына!
У ваконца барабанюць:
„Выйдзі, малайчына!“

Выйшаў. Чуе, нехта плача,
Ціха нехта кліча:
„Сюды, сэрца! Гэй, бурлача,
Пакажы аблічча!“

Йдзець. На прызьбе каля хаты
Бачыць: маладзіца,
Пекнай ўроды, строй багаты,
Ясны, аж мігціцца.

Стаў і словам не азьвецца,
Моцна задзіўлёны;
А яна—дык проста рвецца:
„Мілы! улюблёны!

Сядзь-жа поруч, ня цурайся,
Ды любі мяне ты.
Ты-ж наблутаў, ня сьпірайся,
На мяне цянеты“.

Сеў хлапец несамавіты,
З ведзьмаю абняўся;
Вецер, злосна прагавіты,
Роў і ня спыняўся.

Рукі белы аплятаюць,
Ўюцца каля шыі;
Кроў прыціскі калатаюць...
Вецер сьвішча, вые.

Потым палкім пацалункам
Ў вусны упілася...
Сэрца смокча... і з рабункам
Ў віхры паняслася.

А дзяціна так ля дому
І сядзець застаўся...
Ведзьмы вобраз маладому
Доўга ўспамінаўся.

Як успомніць—сэрца рвецца
Проста у скумацьце,
Да нічога ня прыткнѐцца,
Ўсё сядзіць у хаце.

І канец. А ведзьма? Можа
Да другога ходзіць,
Маладая ды прыгожа,
Жарцікі разводзіць.

63.

ХАТКА.

Там, дзе сумна з краю бора
Ў тры ваконцы сьвеціць хатка,
І з лясной травой гавора
Буракоў і бульбы градка;

Дзе жаўцеюць тры загоны,
А на кожным па дубочку,
Ціха шэпча бор зялёны
І глядзіцца ў ручаёчку;

Дзе чутно, як сонца грае
На праменьнях сьвету горда,
І ніколі ня зьмірае
Зык шчасьлівага акорда,—

У тэй хатцы, пры тым боры
Асялілісь аж тры горы:

Сын даўно пайшоў ў жаўнерку,
Хоць, здаецца, меў ён льготы...
Ах, згубілі Казімерку
У жаўнерцы тэй сухоты!

Доню мелі... Божжа воля!
Вышла замуж, ён п'яніца...
Што падзееш? мусіць доля!..
І памерла белаліца.

Мелі месца. Хлеб трымаўся,
Быў рызман, хаця і зрэбны...
Пан лясьнічы штосьць ўзлаваўся:
„Вы мне, кажа, непатрэбны“...

Аж тры жалі, аж тры горы,
Там у хатцы, там пры боры!

64.

ГАБРУСЬКА.

Габруся ў жаўнерку ўзялі,
Ад дамоўства адарвалі.
Ой, Габруська, Габруська!

Зажурыўся стары татка,
Стогне цяжка, плача матка.
Ой, Габруська, Габруська!

Залілася сьлязьмі люба:
— Не запомні, мой галубе,
Мой Габруська, Габруська!

Муштравалі ў войску строга,
Не давалі думаць многа.
Ой, Габруська, Габруська!

Дзяцюкова сэрца б'ецца, —
Бацьку ўспомніць, скаланецца.
Ой, Габруська, Габруська!

Дзяцюковы думкі ўюцца,—
Матку ўспомніць, сьлёзы льлюцца.
Ой, Габруська, Габруська!

А дамовы вецер вее, —
Любу ўспомніць, абамлее.
Ой, Габруська, Габруська!

Захварэў Габрусь на службе,—
Ліст пісаці кажа дружбе.
Ой, Габруська, Габруська!

„Не чакайце мяне ў хаці,
Час прыйшоў мне паміраці".
Ой, Габруська, Габруська!

Ой, сканаў Габрусь ў чужыне,
Жаль ўчыніў сваёй радзіне.
Ой, Габруська, Габруська!

Засмуціў ён сваю любу:
— З кім пайду цяпер да шлюбу,
Мой Габруська, Габруська?!

65.

ЖАБРАЧКА.

Дайце кавалачак хлеба ёй цьмянага,
Дайце пуховага,—дзе-ж ёй узяць?
Што яна возьме з жыцьця бесталаннага?
Дайце, што можаце даць!

Гора памела на сьвеце убогая!
Гляньце: згрыбела, згарбела у крук.
Доля занадта надалася строгая,—
Выбіла шчасьце ўсё з рук.

Была дзяўчынаю, была красуняю,
Была вагонь,—не глядзі, дзяцюкі!
Ўзглянеш—і сэрца праймецца, як куляю;
Мелі пацеху бацькі.

Час надыйшоў, і была гаспадыняю,
Быў гаспадар багатыр на сяле,
Была над мужам царыцай, княгіняю,—
Бог калі шчасьце пашле!

Была і маткаю, была шчасьліваю,
Двох аднагодкаў вялікі ёй даў:
Сына малойца, дачку урадлівую,—
Скуль-дзе і сват пад'яжджаў.

Мела Нупрэіха, мела бяздольная!
Дзе-ж гэта дзелася, як уплыло?
Што-ж, сірацінка, быліна ты польная,
Што учынілась, было?

— „Ой мае дзетачкі, бог мяне грэшную
Пэўне за бацькаўскі грэх пакараў.
Крыўду ўчыніў да згон-веку няўцешную,—
Чым надарыў, адабраў.

Неяк асеньняй парою а поўначы
Хатку няведама хто падпаліў.
Я прахапілась, ўскрычала а помачы:
— Людзі! ратуйце, хто жыў!

З крыку майго і сямейка збудзілася,
Ледзьве пасьпелі на двор уцячы.
Доня за рукі мае учапілася,
Просіць: „матуля, маўчы!“

Мужа я ў гэтым пажары пазбылася:
Кінуўся ў хату па скарб,—ратаваць,
Столь падгарэла ў той чай, абвалілася...
Бог захацеў пакараць!

Ох! Як пачне калі што руйнаваціся,—
Што не рабі ты, а будзе дарма.
Толькі зьнядужаеш, сілаю страцішся,
Скуткаў-жа добрых няма.

Сын у Сібір, ці яшчэ за Сібірамі,
Недзе пайшоў на жыцьцё зарабляць,
Разам з дачушкай пайшла я пад дзьверамі
На пагарэлых зьбіраць.

Дочка ад часу пажэжы праклятае
Чымсь захварэла, няведама чым;
Сохла, бляднела, як зелейка сьцятае,
Покі ня ўмерла саўсім.

З воласьці мела паперу пісаную:
Сына маскаль за нівошта забіў.
Нечым зграшыла дзіцятка рахманае,
Ціхі-ж, паважлівы быў...

От і жыву я на сьвеце зязюляю
Тэй сіратлівай, адна наўсягды.
Сьмерць неўздалечку,—свой век перамуляю,
Збудуся цяжкай нуды".

Змоўкне,—і сьлёзы па твары пакоцяцца,—
Хусткай схісьне іх і далей брыдзе.
Ціха ступае, ўсім целам калоціцца...
Ах! пашкадуйце ў бядзе!

Дайце кавалачак хлеба ёй цьмянага,
Дайце пуховага! Дзе-ж ёй узяць?
Што яна возьме з жыцьця бесталаннага?
Дайце, што можаце даць!

Дайце куточак, а дайце-ж ёй, мілыя!
З ласкай у хату прыміце яе,—
Хай адпачне гаратніца пахілая,
Раны пагоіць свае.

66.

С Ы Н.

Гэй, у чыстым полі ды ня сонца грэе,
Ды ня сонца грэе, ды ня вецер вее,
Ня туман спусьціўся,
Ня дубок схіліўся.

На шырокім полі, ды на тым прасторы,
Ля дарогі самай, на зялёным ўзгоры
З ног дзяцюк звaліўся,
Бразнуўся, пабіўся.

— Ці-ж ня сорам, хлопча, табе маладому?
Ганіць будуць людзі, едучы дадому:
„А ты-ж маладзенькі,
„Піці нядужэнькі!"

— Ой, ня ганьце, людзі,—з гарэлкай ня знаўся,—
Я у сьвет далёкі за шчасьцем пагнаўся
Ад радзімай маткі
Ды із беднай хаткі.

Ды па ўсёй зямліцы, дзе шыбае вока,
І пад самым небам, доле то-ж глыбока
Быў, я цікаваўся,
Шчасьця прыглядаўся.

Не памеў я шчасьця, ды пазнаў я гора
І крыві разьлевы, сьлёз сірочых мора.
Скрозь а скрозь гарота,
Дзе ні глянь,—маркота.

І падумаў зноў я да хаты вярнуцца
Ды да роднай маткі к сэрцу прыгарнуцца,
Рукі цалаваці,
Сьлёзы праліваці,

Каб прыняла сына свайго—валацугу,
Каб прыпяставала, адагнала тугу,
Зелейкам паіла,
Раны пагаіла.

От ня маю сілы, ня трымаюць ногі,
Раптам занядужаў, паў каля дарогі.
Знаць—ня ўбачыць маткі,
Не дайсьці да хаткі!

67.

ЖУРБА І СЬМЕХАЦЬЦЁ.

—„Брынкні, хлопча малады,
У свае цымбалы!
Ты-ж бо, чуў я ад людзей,
Музыкант удалы.
Песьняй ёмкай зьвесялі,—
Заплачу двузлотку.
Хочаш? Выпі напярод,
Спагані ахвотку!“

— Раз журба з сьмехацьцём
Напіліся мёду
І пайшлі на кірмаш
Паглядзець народу.
Вось журба й завяла,
Няуцешна плача;
Сьмехацьцё-ж ля яе
Па дарозе скача.
—„Гэй, сястрыца, пакінь
Разьліваці сьлёзы,
Бо цябе-ж засьмяе
Чалавек цьвярозы.
А-ха-ха! хі-хі-хі!
Ну, чаго, сястрыца,
Не хапіла табе?“
—„Перастань, дурніца!“
—„Не сьмяшы ты людзей,
А давай паскачам!“
А журба яшчэ горш
Закацілась плачам.
„А-ха-ха!“ „І-ы-ы!“

Па дарозе льлюцца;
Йдуць журба з сьмехацьцём,
А людцы сьмяюцца.
От журба і крычыць:
—„Праз цябе выкпіны!“
Сьмехацьцё-ж ёй ў адказ:
—„Не, васпані вінна!“
—„Праз цябе!“—„Праз цябе!“
Увайшлі у спрэчку,
А ў канцы пачалі
Малаціці грэчку.
Тут камар падляцеў:
„Кум з кумой дзярэцца?“
І пачаў ля журбы
Акругом вярцецца.
То у нос, то у лоб
Джыгане—уп‘ецца;
От журба науцёк,
Бо няма дзе дзецца.
Сьмехацьцё-ж не бяжыць,
Даганяць ня хоча,
А з людзьмі над журбой,
Над дурной, рагоча.
От і ўсё. Калі хто
З вас журбу убача,
Дык настрашце яе
Камаровым плачам.
Уцячэць! А цяпер—
Заплаці двузлотку
І кілішачак дай
Прамачыці глотку.

68.

СПРЭЧКА.

Дзядзька Тодар, два Пранцішкі,
Сват Гілерык, кум Тамаш
Раз ў мястэчку Зацьвілішкі
Насьмяшылі ўвесь кірмаш.

Што было прадаць—прадалі,
Кум Тамаш зьмяняў каня,
Покі ўсё панакуплялі,
Зірк—ай-ей: каля поўдня!

—„Праўда, справіліся ёмка,
Але-ж, хай ты... во, абед“...
—„Ну, дык што! Хадзем ў карчомку!“
На суседзяў так сусед.

Узялі кварту. На закуску
Пару ўзялі тараноў.
Што-ж ім кварта? На затруску!
Ўзялі квартачку ізноў...

Больш пілі дзядзькі, чым елі:
Квас, гарэлку, піва, мёд.
Быццам чмелі загудзелі,
Як і ўвесь ля іх народ.

Хоць там словы ледзьве вяжуць,—
Тэй бяды! А што-ж маўчаць?
Той што-сь скажа, той заўважыць,
Кіне чарку наліваць.

Так ад цэнаў, бульбы, меры,
Што на рынку хвальш дае,
Зачапілі справы веры
Дый... шчапілісь за яе!

Гэтта слоў ім не хапіла,—
Знана вёска: словаў брак!
Потым, слова—хіба-ж сіла?
Хіба-ж зробіць, як кулак?

От і пляснуў Тодар ў вуха
Па-суседзку Тамашу,
І паўстала завіруха
У карчме на кірмашу.

Кум Гілерык, сват, Пранцішкі,
Тодар—зьвіліся ў клубок...
Ўсё мястэчка Зацьвілішкі
Раптам зьбеглася ў шынок...

Праз гадзіну дзед Ігнацы
Ўсіх бусайлаў тых мірыў:
—„Ці-ж ня сорам гэтак, братцы?“
Дзед паважна гаварыў:

„Ну, на ліха вам сварыцца?
З розных вераў вы—адны
Дзеці гэтае зямліцы,
Краю гэтага сыны.

Вера з жыцьцем ўсім даецца,
Хто іх даў,—яму іх знаць!
Дурань той, хто спадзяецца
Веры сілай пазьднаць.

Мы і так, браткі, зьнявагі
Досыць мелі ад чужых,
Каб спрачацца без развагі.
Ці ня цешым толькі іх?

Глузу хіба-ж вы ня мелі?
Біў чужы вас лёгка сьмех?
Эх, вы, шэршні! Эх, вы, чмелі!
Ну, ня сорам вам?.. Ня грэх?“...

БССР Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна

69.

КАМУ ШТО.

(Жарт).

У самы жар, у летні час,
Ужо у поўдзень, па абедзе,
Назаўтра ў горад, на кірмаш,
Народу цьма ідзець і едзе.

Ну, ехаць добра, хоць пячэ,
Але-ж ісьці—дык во дзе мука!
А як з паклажаю яшчэ,
Дык то найгоршая дакука.

Хаця каб крышку адпачыць,—
Ідзеш, ідзеш, ды трэба сесьці,
Бо пуд ці пару валачыць—
То не пярынку ў жмені несьці.

Калі-ж карчма,—ну, тутка стой!
Тут можна выпіць і паесьці,
А за работай мілай той
З знаёмым гутарку завесьці.

Зыйшліся гэтак ў карчме раз
Наш беларус, цыган, хахол,
І неяк трапіла на час,
Што за адзін прыселі стол.

Адзін узяў сабе мядку,
Другі—гарчыну, той—поўпляшкі;
Пакуль сядзелі ў халадку,
Зьвялі знаёмства,—то-ж ня цяжка.

Цыган да гораду сьпяшыў,—
Каня ён добра знаў ўсе вады,
Купляў, мяняўся-не грашыў,
Купцам на коні даваў рады.

Хахол Маўчба ішоў з работ,—
Заробак добры меў, багаты;
Шукаў сябра, каб без клапот
Даехаць з ім да роднай хаты.

У горад брыў цялё прадаць
Наш Янка Цьвік, празваньнем Дыба;
Падатак мусіў ён аддаць,
А так—цялё самому трэба.

Адно вось так, другое не,—
Сядзяць і зюкаюць паціху,
Ажно глядзі ты, вохці мне!
Зайшлі у спрэчку, клічуць ліха.

Каб іх на царства узьвялі,—
Аб гэтым здумалі спрачацца!—
Дык што рабіць-бы пачалі,
Якою працаю займацца?

„Вось я, здаецца, добра-б жыў,
Гульнуў-бы я тады бясьпечна,
З сваім народам-бы дружыў,
Кулеш ўсё еў-бы ды яечні".

Так кажа Янка першы наш.
„Ну, дзе твой розум, белавусы?"—
Крычыць Маўчба.—„Саўсім няма-ш
Між вас разумных, беларусы!

От, я іначай бы зрабіў:
Ў садку пад вішняю ляжаў-бы,
Увесь урад пры мне-б тут быў,
А я-бы правіў ды сьпяваў-бы.

А есьці—еў-бы з салам хлеб,
Крышыў галушкі бы зубамі,
І сала з салам і яшчэ-б
Я сала так-бы еў часамі".

„Каб вас пярун!—крычыць цыган:
Абодва варты вы нямнога,—
Вунь, той аббіты ўвесь саган
Хоць грошык варт, а вы—нічога!

Каб я папаў у каралі,
Дык мне ўсё гэта было-б мала.
З казны-б украў я тры рублі,
Украў каня—і... махні драла!"

70.

ВАРАЖБА.

(Засьцянковая аповесьць).

Бліжыцца поўнач. У гэтай парэ
Сон пахаджае па панскім дварэ.
Сьпяць, паканчаўшы звычайную працу,
Чэлядзь ў пякарні, паны у палацу;
Толькі стары вартаўнічы Ігнацы
Ходзіць з клякоткай і піпкай сваёй:
Двор сьцеражэ ад людзіны ліхой.

Ходзіць стары і мурмоча пад нос:
—„Ну і пракляты-ж сягоньня мароз!
Новы кажух прабірае, пся вера,
Быццам кажух—не кажух, а папера.
Брэша, ня зломіць старога жаўнера,—
Панна Эмілья, хай бог ёй аддасьць,
Вызваліць з гора, ня пусьціць прапасьць.

Цёнгля, як толькі пачнецца цямнець,
Зараз палынаўкі з кухні нясець,
Міла глядзіць і ласкава сьмяецца:
—Хочаце можа, Ігнацы, пагрэцца?—
Гэткі парадак ня ўсюды вядзецца!
Добрае сэрца! Павет абыйсьці,
Роўную паньне, бадай, каб знайсьці“...

Адвэнт на сходзе. Яшчэ да Каляд
Тыдзень астаўся адзін акурат.
Неба у зорках, і кожна з іх зьяе,
Месяц зялёны свой сьвет пасылае,

Лёгкі марозік за шчокі хапае,
Сьнег пад нагамі прыемна рыпіць,—
Ведае варту Ігнацы,—ня сьпіць.

Панна Эмілья тым часам сабе
Вечар праводзіць у нейкай журбе:
Нейкія брэдні плятуцца дзяўчыне—
Быццам яна не ў дварэ ахмістрыня,
Быццам яна ня жывець ў ахвіцыні,
Быццам яна няма ведама хто,
Хочацца сэрцу няведама што.

Ўспомніць мамульку, татульку, свой дом,
Ўспомніць сябе невялічкую ў ём,
Старшага брата і няньку-бабульку,
Тэклю, Агатку, Ганульку, Аршульку,
Даўніх равесьніц... кароўку Рабульку...
Дзе яно ўсё? І ня вернеш тых дзён,
Зьнікла, як дым, расплылося, як сон!...

Страшна і ўспомніць далёкі той год
(Чорным яго называе народ),—
Пошасьць з касою па сьвеце хадзіла,
Панну Эмілью сіроткай зрабіла,
Родных, сямейку зямлёю пакрыла.
Доля, няйначай,—ў яе ўсё руцэ:
Ўзялі паны гадаваць пры дачцэ.

Ўстане, паходзіць і сядзе ізноў,
Б'ець у галоўку гарачая кроў;
Нейкія ў сэрцы прарваліся шамы,
Твар то збляднее, то зробіцца ў плямы...

Стане прад маткай сьвятой з Вострай Брамы,
Просіць: „Прачыстая, згінуць ня дай,
Гора адкінь, ад бяды захавай!“

Ручкі заломіць, і сьлёзы цякуць...
Новыя думкі ізноў набягуць,—
Жыцьце у людзях сабе выкладае.
Цяжкае жыцьце! Хаця спагадае
Маткі заступніца, пані старая,
Пан—як-бы родны... Нявесела жыць!
Час у жалобе, ў маркоце бяжыць.

Хочацца сэрцайку ласкі ня той,—
Хочацца спогадзі паньне другой...
Тэкля, Аршулька, Ганулька—малжонкі,
Шлюбныя носяць на пальцах пярсьцёнкі...
Моліцца панна да ўласнай патронкі:
„Панна сьвятая, ты неба ўмалі,
Вернага друга мне ў жыцьці пашлі!“

Потым ўсьміхнецца прыгожа... Каму?
Ведама,—пэўне, яму аднаму...
Рожы цьвітуць на бялюсенькім твары.
Што-ж тут за цуд і чые-ж гэта чары?
Праўду сказаць?...—Вінаваты гусары.
Ну, хоць ня ўсе, дык прынамсі адзін
Паньне прычынай маркотных гадзін.

Статны, прыгожы,—праўдзівы жаўнер;
Гляне—як сокал! Які-ж кавалер!
Майстар на жарты які, на хіхоты;
Як удаецца ў шабункі, ў залёты,

Лёсткі пушчаць—навучыся ў яго ты!
Як ён часамі умее глядзець:
Ў танцы які!—не пазволе сядзець!

Ручку як сьцісьне, на вуха шапне
Слоўца такое, што й сэрца замрэ!
Шкода, нядоўга яны пастаялі...
Толькі тры дні усяго балявалі
Гэтта, ў дварэ, і паехалі далей.
Рушылі ў Вязьму, а стуль пад Маскву.
Чуець паненка, маўляў на яву,

Як прад ад'ездам ён цяжка ўздыхаў;
Помніць—навекі аб ёй прысягаў;
Як ад'яжджаючы, бачыць, скланіўся...
Праўда-ж? Ці помніць? Ці, можа, забыўся?
Любіць? Ня любіць?... Ў другую ўлюбіўся?
Можа ўдаваў закаханьне на жарт?
Трэба аб гэтым спытацца у карт!

Праўда, што адвэнт, і грэх варажба,
Што-ж—калі гоніць ў сухоты журба!
Бог міласэрны няхай выбачае...
Панна Эмілья ў красэлка сядае,
Талью картуе, шэсьць карт выкладае,
Сёмая карта кладзецца пад ніз:
Хітры пасьянс пачынае—„маркіз".

„Любіць? ня любіць? Любіў? ня любіў?...
Верным астаўся?... Ці верным ня быў?"
Шэпча паненка. Пасьянс збунтаваўся...
„Дзе-ж той чырвовы кароль падзяваўся?

Мусіць ня любіць!... не, гэты ня ўдаўся!.
Іншы спрабую цяпер разлажыць“...
Час памаленьку бяжыць ды бяжыць.

Поўнач прайшла. У дварэ пятухі
Раз прапяялі з-пад цёплай страхі.
Крайчыкам месяц з-за туч выглядае.
Панна Эмілья варожб ня кідае,
Новы, хітрэйшы пасьянс раскладае:
„Любіць, ня любіць, любіў, ашукаў,
Верным астаўся, ці ім ня бываў?“...

Рыпнулі дзьверы... І вось на парог...
Панначка зірк! — Гэта-ж ён, далібог!
Палец да губ прылажыў, усьміхнуўся,
Дзьверы прымкнуў за сабой, азірнуўся.
— Панна чакала, каб я дый вярнуўся?—
Ціха на пальчыках к ёй падыйшоў.
Дзеўча адразу ня знойдзе і слоў.

Потым зьдзіўленьне крыху адыйшло.
„Скуль пан узяўся і што прывяло?“
Гэтак пытае. Урода асанны.
Сам, як ягнятка, ласкавы, рахманы.
— Жыць не магу без каханае панны!
Мусіць нідзе не спаткаю такой...
Дай ты мне шчасьце, вярні мой спакой!—

Рукі злажыў і на коленкі стаў,
К ножкам дзяўчаці галоўкай упаў.
Панна Эмілья, смуціўшыся гэтым,
Хоча устаць, адхіснуцца, а дзе там!

Ён ня пушчае і моліць ўсім сьветам:
— Будзь гаспадыняй, царыцай маёй,
Сэрца зьлячы мне, душу заспакой!—

Што тут рабіць? Гэта-ж могуць пачуць.
Потым у вочы усе засьмяюць:
„Панна у ночы гасьцей прынімае!“
Ручкай гусара з кален падымае;
Просіць устаць, ня крычаць, сунімае,
Садзіць у крэсла, прыносіць вады...
„Ціха, мой пане, наробіш бяды!

Людзі пачуюць,—нічога табе:
Сеў дый паехаў, і сам па сабе.
Я-ж і на заўтра тут мушу астацца;
Будзе ад сораму недзе схавацца,
Людзі пачнуць як навокал сьмяяцца:
„Ў панны Эміліі ёсьць кавалер“.
— Хай не сьмяюцца! Бо плакаць, павер,

Будуць, паненка, яны над сабой,
Покуль гуляю яшчэ з галавой,
Покуль ня судзіць мне доля прапасьці.
Хіба сама ты захочаш напасьці,
Думкі ня споўніш маёі аб шчасьці.
Ведай: прыехаў забраць я цябе,
Ў разе-ж нязгоды — застрэліць сябе.

Бачыш, кладу я на стол пісталет:
Коркі падняты, набоі, як сьлед.
Добрая гэта турэцкая штука!
Дзед адабраў на вайне ў мамэлюка;

Можа сягоньня прыдасца на ўнука.
Воля твая: рассудзі, выбірай, —
Шчасьцем дары ці на сьмерць пакарай.

„Пан не даеш мне з чаго выбіраць,
Я не хачу ні судзіць, ні караць!
Як-жа так раптам... ці-ж можна, скажэце?
То-ж ня гульня, а мы з панам ня дзеці,—
Трэба падумаць яшчэ, паглядзеці“...
— Панна Эмілія, мне не пярэч!
Хіба ня любіш?... —„Ня панская рэч!

Пану да гэтага дзела няма,
Ведаю думкі свае я сама.
Можа-б любіла, каб гэтак ня ягліў,
Так ня пужаў і з адказам ня нагліў,
Быў да паненак ня гэтак павадліў,
Можа-б тагды і пайшла... А цяпер?!“—
Панна збляднела, маўляў-бы папер;

Хоча сказаць і баіцца сказаць,
Вочкі спусьціла, павекі дрыжаць...
Той-жа гусар, як смала, прычапіўся,
Ручку цалуе і з крэсла ўсхапіўся,
Зноў на каленях у ног апыніўся.
— Слонейка,—просіць,—кажы, не чакай:
Ў пекла мне судзіш ці разам у рай?

Любіш — ня любіш, шкадуеш ці не,—
Дай-жа спакою, ня мучай мяне! —
Сэрца паненскае, ведама, з воску,
Возьмем мы места ці зьвернемся ў вёску:

Толькі-б агоньчык—і зараз-жа сьлёзку,
Ясную сьлёзку на вочка пашле.
Хоча, ня хоча ды й скажа: „але".

Гэтак і з паннай Эмільяй было.
Нешта ад сэрца к грудзям падыйшло,
Потым у горле клубком перасела,
Быццам-бы выскачыць сэрца хацела;
З вочак сьлязінка скацілась нясьмела,
Сьледам другія сьпяшаюць ісьці...
— „Люблю, — кажа панна: — люблю... адпусьці!"

Ўскочыў, падскочыў гусар малады
Так, як-бы чорт ад сьвянцонай вады.
Рады, сьмяецца і ручкі цалуе,
Пусьціць, абніме, ізноў прымілуе,
Ну, не раўнуючы, мора хвалюе!
Нават апомніцца ёй не дае,
Рупіць зьбірацца, капоцік ўзьдзяе.

Гасіць лаёўку, вядзець на парог,
Клямку шукае... Ды бог засьцярог:
Панна зірнула каханку у вочы, —
Так, як вугольлі, гараць сярод ночы...
Верыць—баіцца, ня верыць—ня хоча.
— „Хто тут?"—пытае. Ён цягне, маўчыць...
Панна ў трывозе тады як ўскрычыць:

— „Маці прачыстая! Ў помач прыдзі!
Згінь ты, шатане,—мара, прападзі!
Згінь, прападзі ты, нячыстая сіла!"—
Правай рукою яго ахрысьціла.

Чуе: рука, што трымала, пусьціла.
Прывід той страшны прапаў ў цемнаце:
— Кінь варажыць ў адвэнтовым пасьце!—

Голас чужы з-за дзьвярэй прагрымеў.
Панна... прачнулась. Ліхтар абгарэў,
Мусіць даўно дагарэла лаёўка,
Смрод у сьвятліцы... балела галоўка.
Ціха праз сені прайшла пакаёўка:
Стары гадзіньнік паказвае пяць...
— „Ах, як заспалася!.. Трэба-ж так спаць!“

71.

КАНЕЦ ПАЎЛЮЧОНКА.

I.

Ноччу позна, па кірмашы,
Ехаў з места Паўлючонак,
А празваньне меў „Жучонак“,
Гаспадар быў з вёскі нашай.
Ўнучак Паўла, сын Антося
(Той быў к пану дапушчоны),
Баўтрамеем быў хрышчоны;
Чалавек быў з мухай ў носе.
Едзе ў страсе: цёмна, ціха...
У дальнім лесе хтось рагоча.
Уляпіў у цемню вочы,
здаецца... Што за ліха?
Нехта йдзець сярод гасьцінца,
Пэўне двое, штосьць гамоняць.
„А каго тут чэрці гоняць?“—
Аж падняўся на драбінцы.
Бачыць: нейкіх аж тры цені
У бок зышлі і разам сталі.
Пад‘яжджае. Ўсе аддалі
Хвалу божаму іменю.
— „Хто тут блудзіць?“ запытаўся
Баўтрамей ў ліхой трывозе,—
Бо тагды па той дарозе
Не адзін гультай бадзяўся.
— „Старцы, дзядзька!— Кныш, Вароба
З Краснай Долі, Крук Нічыпар“ ...

— „А бадай-жа вас люцыпар
Ці напасьніца-хвароба!
Чорт вас водзіць тут, галыткі,
Добрым людзям на спатканьне,
Хай вас трасца“... —„Годзе, пане!
Час пакінуць звычай брыдкі,—
Кажа Кныш.—Ці ты маленькі,
Што на нас дарма зларэчыш?
Нам хады не запярэчыш
Па гасьцінцы. Можа ўсенькі!“
— „Нас ня лай—Вароба прэціць,—
Бачыш, ночка: допуст боскі;
Хоць нямнога вёрст да вёскі,
А ўсяго здалееш стрэціць.
Лепш зрабі ты па-хрысьцьянску,
Падвязі, памей к нам ласку,—
Змардаваліся мы цяжка,—
Чымся лаяць па-паганску“.
— „Вох, разумны дзе знайшоўся!
Хочаш езьдзіць на дурніцу?
Маеш дулю, пане Грыцу!
Не з такім, браток, зышоўся!“
Сьвіснуў пужкай па канёчку,
Мэрам бічык, а ня пуга.
„Но, Буланы! Но, шаўлюга!
Марнаваць ня сьлед нам ночку“.
— „Гэй, суседзе,—Кныш зноў крача,—
Дай прысесьці-ж на драбінку!
А у цяжкую гадзінку
Мы заплацім па-жабраччу“.
— „Ну, ну, як-жа,—маеш збыткі!—

Так Баўтрук ў адказ рагоча.—
Ходзіць ў латах, яшчэ хоча
Заплаціць; а чым, галыткі?“
Тут Нічыпар рыкнуў басам,
Моўся той мядзьведзь з дубровы
(Голас надта меў здаровы):
„Падвязі да карчмы, васан!“
— „Што дасьцё?“—Баўтрук на гэта.
— „Што-ж у нас? Кіі, ружанцы“...
— „Дык прасіце, абадранцы,
Хай лазаты дасьць карэту!“
Ўдарыў лейцам. Конь падскочыў,
Як падстрэлена казуля.
— „Лепі чорта падвязу я!“
Баўтрамей пад нос мурмоча.

II.

Мрок запаў яшчэ цямнейшы,
Хоць калі ты шылам ў вочы.
Ў каляіне гразь хлюпоча,
А Баўтрук цяпер сьмялейшы:
— „Хутка будзем, коню, ў хаці,
Скончым нашу райтараду.
Гаспадыня будзець рада,—
Выйдзе з хаты спатыкаці!“
Аж цыганскую гаворку
Чуе раптам прад сабою.
Быццам йдуць яны гурбою
І вядуць аб нечым спорку.
— „От яшчэ ня меў хваробы—
З цыганамі мець спатканьне:

Сядзець сам без запытаньня,-–
Зьвесны нораў цыгановы!“
Як ня хоча ззаду быці,
Конік цягне дробным трусам...
Даганяе, хоць і мусам,
Зраўнаваўся,—што рабіці!—
Што за дзіва?—Паўлючонку
Падкальнула ў сэрца нешта.
Толькі трое, а дзе рэшта?
Два цыганы йдуць і жонка.
— „Здрастуй, бацьку!“ гыркнуў з боку
Цыган доўгі, чорнатвары,
І другі за ім да пары
І цыганка.—„Скуль, здалёку?“
— „Еду з торгу.“—„А, вяльможны!
Падвязі да карчмы хоця,
Бо па гэтакай хлюпоце
Пехатой ісьці ня можна“.
— „Рад-бы я, ды сам ты бачыш,
Што на колах, братка, цесна,
Ня усядземся сумесна“...
— „Эй, аб чым ты, бацьку, плачаш!
Цыган, пане, як вужака:
Хоць ў шасьцёх здалелі-б сесьці!
А ля карчмы хочам зьлесьці,—
Не замучыцца каняка“.
Не пасьпеў Баўтрук поўслова
Адказаць на просьбу гэту,
А мужчыны і кабета
Шась на колы Баўтруковы!
— „Н-но! Гані сваю шаўлюжку!“

„Дадай ходу!“ І рагочуць.
Штосьць па-свойму там стракочуць,
Адабралі лейцы, пужку...
Буркнуў быў на тыя рэчы
Баўтрамей, дык—д‘ябла дзеці!—
Ледзьвя здолеў усядзеці,—
Так заштурхалі у плечы.
— „Сядзь спакойна, ты, зрабніна!
Кінь плявузгаць гэтта лішку:
Вып‘еш ў карчме тры кілішкі,
І заплацім што павінна“.
Што ты зробіш? Няма волі,
Іх-жа сіла, перамога.
Дзякуй толькі пану богу,
Не спаткалася іх болі.
Праз гадзіну—час кароткі
Баўтрамею доўгім здаўся—
Сьвет з ваконца паказаўся
У карчомцы пана Ноткі.
— „Ну, вот, бацьку, гаварыў ты!
Зараз зьлезем, купім гары
І заплацім тры таляры,—
Мы ня любім жаднай крыўды“.

III.

Цесна ў карчме,—ў бочцы мэрам
Селядцоў, людзей набіта.
Дымам лямпачка спавіта
Тутунёвым, едкім, шэрым.
Гоман, грукат, сьмех і спрэчка..
Гэнам граюць, гэтта скокі

Выраблюць, ўзяўшысь ў бокі,
Аж трасуцца сьцены, печка.
Баўтрамей спацеў, чырвоны
З цыганамі п'ець гарэлку;
Скінуў сьвіту і мяргелку;
Выглядае моў шалёны.
Мусіць дзюбнуў чарак многа,—
Нешта старцаў ўспамінае,
З іхняй долі выкпівае
І сьмяецца з пана бога.
— „От, халеры! Дай ім хлеба,
Дай рызманчык, тое, сёе,
Гультаям!.. За што, якое?
Суляць ласку божжу з неба...
Ласку божжу!... Абібокі!
Мне пуховы хлеб смачнейшы,
Ў роце коле, а сытнейшы.
А нябескі...вох, далёкі!
Кажуць, ў небе ёсьць збавіцель.
Мне здаецца—людзі брэшуць,
Языкі аб зубы чэшуць:
„Ёсьць збавіцель, спакусіцель"...
Тут цыган, што быў ля боку,
Лезе проста цалавацца:
— „Можаш з царствам распраўляцца,
У галоўцы маеш клёку,
Маеш, братка! мусім выпіць,
Я з бутэлькі вылью рэшту".
На другіх міргнуўшы нешта,
Абмачыў ў гарэлцы кіпець.
Баўтрамей, як выпіў гэта,

Крэкнуў, плюнуў, аблізнуўся...
Цыган хітра усьміхнуўся.
— „Прад табою, кажа, мэта:
Хочаш злота мець, як бруду?
Хочаш срэбрам слаць падлогу?
Хочаш медзі? Дам спрамогу,
Ўсё дастану, ўсё здабуду.
Хочаш панам быць прыдворным?
Грапам, князем, дваранінам,
А ня бедным селянінам,
Не хадзіць у целе чорным?..
Хочаш, браце?.. Ну, кажы нам?“
Баўтрамей крыху зьмяшаўся:
— „Я, папраўдзе, ня зьбіраўся
Быці нейкім кармазынам...“
— „Ён ня думаў,—вох прастота!
Хіба ты ужо напіўся?“
Цыган зноў-жа прычапіўся:—
„Ты кажы, ці ёсьць ахвота?“
— „Быці панам... Жыць ў дастатку...
Быць ў пашане... Ўсё пазнаці,—
А за гэта... Што вам даці?!“
— „Што? Драбніцу толькі, братку:
Нам душы тваёй ня трэба,
Не бяром цяпер ні ў кога.
Адступіся ты ад бога,
Адступіся ты ад неба.
Згода, слухай? Кажы: „ладна“!
Вып‘ем разам гарнец мёду“.
Баўтрамей ня ўчуў падходу
І згадзіўся безаглядна.

Цыган ўстаў з услону важна,
Ў правы, ў левы кут падзьмухаў.
— „Ну, цяпер устань і слухай,
І кажы за мной выразна“.
Стаў Баўтрук, зьмяніўшысь ў твары,
Ўвесь дрыжыць,—калоціць фэбра,—
Дзеля злота, панства, срэбра,
Прамаўляе ціха чары.
З кожным словам ўлазіць звольна
Сум ў душу і страх сьмяротны.
Прамаўляе неахвотны,
Над сабой цяпер ня вольны.
. . . . . .
. . . . . .
. . . . . .
Скончыў цыган.—„Сядзь, ягомасьць,—
Кажа чорны,—скончым дзела,
Пагуляем, братку, сьмела
За прыемную знаёмасьць“.
Баўтрамей вачыма лыпнуў,
Як-бы зараз ён прачхнуўся,
Глынуў сьліну, папірхнуўся.
—„Я залішне, мусіць, лыкнуў.
Толькі што я відзеў страхі:
Ясны анёл з чорным біўся,
Гром грымеў, а сьвет зацьміўся,
І прапалі неба знакі.
Хтось душыў мяне за горла,
Аж пачуў я ў вушшу звоны,
Аж цяпер здаюцца шпоны
Тут, на шыі. Дух запёрла“...

—„Глупства гэта. Вып'еш болі,—
Мары, пане, зараз зьнікнуць,—
Цыган кажа,—нават пікнуць
Не адважацца ніколі".
Выпіў кубак мёду поўны
Баўтрамей, другім паправіў.
„Ты, цыгане,—кажа,—правіў,
Што я буду пану роўны.
Буду злота мець бяз ліку,
Срэбрам ў хаце біць падлогу,
Дай-жа грошы колькі змога,
Хоць-бы тайстру невяліку".
—„О!.. За гэтым, брат, ня стане,—
Будуць грошы, будзе панства!
Маеш патэнт на дваранства
Гэрбу Воўка на Кургане.
Маеш грошы: чыстым злотам
Мех скураны вось набіты.
Ну, цяпер, здаецца, квіты,
Ці чаго яшчэ ахвота?"
—„Дзе, у ліха, больш хацеці?—
Баўтрамей ў адказ сьмяецца.—
Хопіць мне і застанецца
Ашчасьлівіць нават дзеці!"
—„Досыць? Добра! Схочаш болі,
Дзьмухні толькі ўлева, ўправа,—
Па загаду зробім жвава,
Як ніхто, нідзе, ніколі.
Віват!—крыкнуў цыган,—слава!
Жычу шчасьця Баўтрамею!"
І пайшла ў карчме завея,

І пайшла ў карчме забава.
Ўсё сплялося ў нейкім віры:
Рукі, твары, плечы, сьвіты,
Кужаль панскі, аксаміты,
Порт мужыцкі, скрыпкі, ліры;
Ў дзікім тахце рэюць зыкі.
Баўтрамей з цыганкай скача:
—„Хадзі, імасьць, хадзі, ваша!
Скачы, пані!.. Чыкі-брыкі!“...

IV.

Цэлу ноч сядзела жонка,—
Муж з кірмашу зараз будзе...
Прывязьлі ёй ўранку людзі
Няжывога Паўлючонка.
Ён загінуў, грэшны, блізка,
Ў дзьвюх вярстах ад вёскі роднай,
У дрыгве сырой, халоднай,
У вадзе густой і сьлізкай.
Там ляжаў ў асоцы голы,
Твар абдзёрты меў і рукі...
— Гэта, пэўне, чорта штукі,—
Разьнялося навакола.

Сто гадоў таму здарэньню,
Можа, нават, больш мінула.
У зямліцы тры заснула
Чалавечых пакаленьні,—
Род загінуў Баўтрамея.
З часам сьмерць усё выводзіць!
А паданьне ў вёсцы ходзіць
І дзядоўскім духам вее.

72.

ШЧАСЬЦЕ МАЦЕЯ.

(Старадаўная казка).

Жыў сабе ў сяле Мацей,
Меў шасьцёра ён дзяцей;
Сядзеў, бедны, без работы,
Бо ня меў к таму ахвоты.
Красьці ён высьцярагаўся,—
Знаць, астрога крат баяўся.
А шасьцёрка дзетак плача,
Трэба хлеба ім, аднача.
Вось ад гэтае нядолі,
Каб ня чуці стогнаў болі,
Рушыў раз Мацей ў дарогу
Проста ў рай, к самому богу.
Ўздумаў праўды дапытацца,
Што рабіць, за што узяцца.
Брыў ці многа ён, ці мала,
Ў лес густы яго прыгнала.
Поўдня, мусіць, йшоў па лесе
Ды зблудзіўся; нос павесіў,
Сеў пад дрэвам і чакае,
Можа пройдзе хто. Гукае.
Толькі ўчуў ён: нехта едзе;
Лес трашчыць, як ад мядзьведзя,
Конь капытам так грукоча...
Уцячы Мацейка хоча.
Хоча ўстаць—ніяк ня можа...
— Вось бяда дзе, моцны божа! —
Зьліўся потам ўвесь, трасецца...

Бачыць, — сьвет к яму нясецца:
Бяжыць ясны, пекны конь,
Ўвесь гарыць, маўляў агонь;
Збруя белая раменна
Ўбрана ў золаце адменна;
На кані, узяўшысь ў бокі,
Чалавек сядзіць высокі,
Пекна надта прыадзеты,
Але быццам з таго сьвету.
Вось узьехаў на паляну,
Дзе сядзеў Мацей зьляканы.
Конь спыніўся, стаў, чакае,
З воч яго агонь шугае.
— „Што сядзіш тут, маладзец?“ —
Так спытаўся той язьдзец.
„Куды брыў, на што сабраўся?“
Мацей духу тут набраўся,
Зірнуў проста на яздца.
— Ў імя сына і айца!!!
Сьвяты Юр‘я, пэўне, гэта:
Такі з твару, так адзеты,
Як я бачыў на абразу! —
Пасьмялеў Мацей адразу
Ды й прамовіў да сьвятога:
— Я—Мацей з Бару Крутога,
Шмат дзяцей, паночку, маю,
А карміць іх чым — ня знаю.
Працаваў-бы — не здалеці,
Бо гультай я ў гэтым сьвеці!
Красьці? — Краў-бы, дык баюся,
Бо, крый божа, пападуся

Да пачцівых як людзей,
Так паходзяць ля грудзей,
Што жыць стане неахвота!
Вось, такія мне клапоты.
Я і думаў, як мне быць,
Дзе спакой сабе здабыць?
Не дайшоў сам да нічога,
А надумаўся — да бога
Я пайду і запытаю,
Што рабіць на сьвеце маю?
Ды у лесе во зблукаўся,
Начаваць у м сабраўся...
Вы-ж, паночак, быць павінна,
Ў неба едзеце ў гасьціны?
Дык мне ласку там зрабіце—
Аба мне усё скажыце
І аб дзетках маіх разам.
Што там скажуць? З пераказам
Сюды едзьце проста ў лес.
— „Добра, добра, я увесь
Для цябе гатоў служыць!
Як мне толькі не забыць
Тое ўсё, што ты казаў?
Я-б паяс расьпіразаў
На ўспамін, — дык меч спадзе,
Што параіш у бядзе?“ —
—Эт, панок! Я спосаб знаю,—
Простым розумам параю:
Каб вам мець перасьцярогу,
Не забыцца-б ў пана бога, —
Адно стрэмя залатое

Вы пакіньце мне на тое,—
Помніць будзеце ўвесь час,
Што я тут чакаю вас.—
— „Добра, розуму бярэмя
Маеш, чалавеча! Стрэмя
На, вазьмі маё; сядзі
Ды чакай мяне, глядзі!“
І, Мацею стрэмя даўшы,
Сам паехаў, паскакаўшы
Зноў па лесе на каню...
Бляск ідзе, маўляў з агню—
Зьяе стрэмя залатое.
— „Вот-бы мне яшчэ другое!
Гэтак думае Мацей:—
Было-б хлеба для дзяцей.
(Ўзрос Мацей і жыў бяз цноты,
Ня было бацьком турботы,—
Ды ня дзіва, што лазаты,
Бэльзэбула сын рагаты,
З гэткай думкай падступіў,
А Мацей яе ўхапіў).
Потым стрэмя закапаў,
Палажыўся і праспаў
Аж да заўтра, да паўдня...
Пралупіўшы толькі вочы,
Чуе: конь ізноў грукоча,—
Сьвяты Юр‘я то нясецца.
Мацей ў вус сабе сьмяецца.
Многа часу не чакаў,
Хутка Юры прыскакаў;
Конь пад ім гуляе, скача.

— „Ну, ты, слухай, небарача:
Аб табе з тваёю справай
Я ў абедзе за расправай
Богу ўсё, як ёсьць, сказаў;
Пастараўся, як зьвязаў,
І як ты жывеш, гаруеш
І з дзяцьмі свайміі бядуеш;
Як галаву сваю ламаеш
І які ты розум маеш!
Так казаў, што ледзь-ні-ледзь
Сам ня плакаў. Адпаведзь
Бог такую табе даць
Меў мне міласьць прыказаць:
Красьці—гэта грэх! Глядзі,
Ты ніколі не крадзі!
Калі-ж будзеш ты што браць
У людзей, то каб аддаць
Надта рупіцца ня трэба,—
От і будзеш меці хлеба.
А то часам і саўсім
Не аддай нічога ім:
„Я ня ведаю, ня браў“...
Калі-ж будуць набівацца,
Ты ня бойся адпірацца,
Шчасьце знойдзеш так сваё.
А цяперака маё
Стрэмя зноў ты мне зьвярні“.
— Стрэмя?! Я яго ня браў!
Хіба-ж пан мне аддаваў?!
— „А ну, як-жа,—можа не?“
— Не давалі, панок, мне!

Мо‘ ў дарозе дзе згубілі,
Мо‘ саўсім бяз стрэмя былі?...
— „Не кажы, Мацей, пустога,
Свайго стрэмя залатога
Я ніколі ня губіў,
Я пакінуў, як тут быў
Ды ад‘яжджаць ужо зьбіраўся“.
А Мацейка ня спужаўся:
— Ясны пане! мяне маці
Ня вучыла, каб ілгаці,
І калі я вам сказаў,
Стрэмя вашага ня браў,—
Значыць, так яно і ёсьць,
Дайце веры, ваша мосьць.—
Так Мацей выпрысягаўся,
Сьвяты Юры паспрачаўся,
Потым бачыць, што дарма
Тут стаяці, што няма
Ўжо ніякае надзеі
Вярнуць стрэмя ад Мацея,
Уздыхнуў дый кажа ціха:
— „Ну, ня жычу табе ліха,
Бог з табою... Спажывай!—
Дробных дзетак паднімай.
Хоць... Па-праўдзе... Каб я знаў,
Стрэмя-б мо’ табе ня даў“.
І, сказаўшы так, сьвяты
Паскакаў у лес густы.
Мацей стрэмя адкапаў
Ды й за пазуху схаваў,
І пайшоў сабе да хаты

І вясёлы і багаты.
Як ён сьцежачку знайшоў,
Як да дому ён прыйшоў,
Як далей ён сабе жыў,
З кім сварыўся, з кім дружыў,
Які ў жыцьці меў ён цэль,—
Я ня ведаю.—„Круцель“!
На яго казалі людзі.
Хай і гэтак сабе будзе!
Мне-ж, калі так ваша ласка,
За маю за гэту казку
Чару мёду паднясіце
Ды закускаю дарыце.

УВАГІ.

(Укладзены В. Мачульскім).

АГУЛЬНЫЯ ЎВАГІ.

Кніга вершаў А. Гаруна „Матчын Дар“ перавыдаецца з зборніку пад гэтай-жа назвай, які быў выдрукаваны ў Менску ў 1918-м годзе. Частка вершаў, якія ўвайшлі ў выданьне 1918 году, была выдрукавана раней у розных выданьнях: „Нашай Ніве“, „Вольнай Беларусі“, „Беларускай Радзе“, „Беларускіх Календарох“ і інш.; частка-ж (каля паловы) была ўзята з аўтографаў і друкавалася ў зборніку ўпяршыню. Некаторыя вершы „Матчынага Дару“ перадрукоўваліся пазьней, пасьля 1918-га году ў пэрыодычных выданьнях (напр., у „Беларускіх Ведамасьцях“, „Каляднай Пісанцы“).

На тытульнай старонцы зборніку 1918-га году стаіць надпіс: „Алесь Гарун. „Матчын Дар“. Думы і песьні. 1907—1914 гг“.

З гэтага надпісу відаць, што вершы, якія ўвайшлі ў даны зборнік, былі напісаны ў пэрыод ад 1907-га да 1914-га г., аб чым і паведамляла „Выдавецкая Камісія“ на адвароце тытульнай старонкі ў наступнай нататцы: „Вершы, умешчаныя ў зборніку „Матчын Дар“, напісаны аўтарам у няволі, — у пэрыодзе 1907—1914 гг. У пачатку ліпня 1914-га году зборнік быў пасланы з Сібіры для друку ў Вільню, дзе яго выданьнем хацела заняцца „Беларускае Выдавецкае Таварыства“. Але паўстаўшая тады вайна адсунула выйсьце кнігі на цэлых 4 гады“.

Надрукаваны „Матчын Дар“ быў ужо пасьля звароту А. Гаруна з Сібіры ў Менск. Сам поэта прымаў удзел у надрукаваньні свайго зборніку і такім чынам фактычна быў адным з радактароў яго.

Нашае выданьне зьяўляецца перадрукам зборніку 1918-га году, пры чым у тэкст паасобных вершаў унесены нязначныя зьмены ў тых выпадках, калі ў тэксьце выданьня 1918-га году былі заўважны друкарскія памылкі, парушэньні рытмікі і граматычна неапрацаваныя месцы. Для папраўак выкарыстаны друкаваныя варыянты і аўтографы, якія захоўваюцца ў Беларускай Акадэміі Навук і складаюць рукапісны архіў А. Гаруна. Пры спасылцы на аўтограф зазначаецца нумар папкі рукапісаў А. Гаруна, разьдзел, падразьдзел і месца аўтографу ў падразьдзеле (напр. XV. 1. 16/24); пры спасылцы на „сшытак“ маецца на ўвазе папка XV, разьдзел 1, у якім гэты сшытак вершаў зьмешчаны.

Мова „Матчынага Дару“ ня можа лічыцца літаратурна-вытрыманай з лексычнага і граматычнага бакоў. Гэта часткова тлумачыцца тым, што значная частка вершаў, якія ўвайшлі ў зборнік, пісаліся, як зазначана ў прадмове да яго, у выгнаньні між 1907 і 1914 гг.

А. Гаруном ужываюцца даволі разнастайныя рытмы, але часам у яго заўважаецца граматычная неапрацаванасьць вершу з тэй прычыны, што для рытму ён адступае ад граматычных норм і звычайнай акцэнтоўкі; спатыкаюцца ў А. Гаруна таксама і перабоі ў рытміцы. Некаторыя выкліканыя запатрабаваньнем рытмоўкі парушэньні граматыкі і націску, а таксама і стылістычна неапрацаваныя месцы агавораны ніжэй ва ўвагах да паасобных вершаў.

Ва ўвагах-жа агавораны і тыя нязначныя зьмены і папраўкі, якія былі ўнесены ў асноўны тэкст вершаў на падставе захаваных аўтографаў поэты і варыянтаў, узятых з розных выданьняў.

У выданьні 1918-га году да паасобных месц некаторых вершаў былі даны тлумачэньні ў зносках пад тэкстам; яны таксама зьмешчаны ніжэй.

Пры ўкладаньні ўваг ужыты наступныя скарачэньні:

„Н. Н.“—„Наша Ніва“ —	газэта, якая выходзіла ў Вільні з 10/23 лістапада 1906-га году да восені 1915 г.
выд.	выданьне.
р.—	радок.
зам.—	замест.
звыч.—	звычайны.

УВАГІ ДА ПААСОБНЫХ ВЕРШАЎ.

1. Людзям.

У выданьні 1918-га году в. „Людзям“ ня ўведзены ў цыклізацыю і стаіць паасобна, як уступ да ўсяго зборніку; у нашым выданьні ён таксама зьмешчаны па-за цыклізацыяй, але падпарадкаваны агульнай нумарацыі.

2. Чаму з маленства...

31 р. ...„з тваёі глебы“ (зам. з тваёй) і „з тваёга неба“ (зам. твайго) ужыты аўтарам для рытму.

3. Начныя думкі.

8 — 12 рр. Ня зусім удала пабудаваны сынтаксычны склад. Назоўныя склоны: „межы“, „курган“, „хвоя“, „каня“—трэба разумець як няпоўныя сказы.

4. Як надарыцца мінута...

19 р. ...„сонейка“. Гарун ужывае таксама: „соўнейка“ (в. № 13), „слонейка“ (№ 23), „сонца“ (№ 22) і „слонца“ (№ 20).

6. Мілая, родная старонка-маці.

1 р. Дактыль ня вытрыманы. Трэба было-б чытаць для рытму „ста́ронка“.

7. Ваўкалакі.

4. р. „Жэр“ А. Гарун ужывае ў сэнсе „зьежа“ (параўн. дзеяслоў „жэрці“).

8. Іванку.

27 р. ...„моў-ся“ зам. звыч. „маўляў“.

9. „Ты, мой брат, каго зваць Беларусам“.

22 р. „п'яніца“ зам. п'яніца—адзін з прыкладаў парушэньня акцэнтацыі для захаваньня рытму, што ў А. Гаруна спатыкаецца даволі часта.

10. Юдам.

25 р. „Падтыканства“ — новатвор поэты, ужыты ў сэнсе „пад'южваньне“.

42 р. У выданьні 1918-га году стаіць: „Вы... імя вам Юды“. Згодна з запатрабаваньнем рытмікі на падставе аўтографу („сшытак“, стар. 40) выпраўлена: „Вы... імя вам Іуды“.

45 р. У выданьні 1918-га г. стаіць „Каты... Вы горай ката“. Для захаваньня рытму выпраўлена: „Вы—каты... горай ката“.

11. Песьня-звон.

Загаловак „Песьня-звон“ памылкова надрукаваны праз працяжнік, трэба—праз злучок.

12. Усе з аднэй мы выйшлі нівы...

8 р. ...„памандраваў“ ужыта поэтам зам. больш пашыранага „павандраваў“.

13. Песьня.

24 р. „Не ў маёй валі“ зам. „Не ў маёй во́лі“ ўжыта поэтам для рытму і рыфмы (з словам „зямлі“—22 р.).

14. У выгнаньні.

5-6 рр. „І ты чужынец, ўсім ня свой здаешся“. У выданьні 1918-га году стаяла „І ты чужынец усім, ня свой здаешся“... Коска перастаўлена ў адпаведнасьці з сэнсам і сынтаксычнай пабудовай сказу.

7 р. ...„адзінец“—стары самец, які ходзіць асобна па лесе.

15. Вясельле.

36 р. „З сябручкамі рады“. У выданьні 1918-га году і аўтографе („сшытак“, стар. 17-18)—„радый“.

38 р. ...„на вочу“ як часта ў А. Гаруна, ужыта для рыфмы (з словам „хочу“—40 р.).

16. Журба.

8 р. „нябы*ц*ьця“ зам. „нябыць*ц*я“ ўжыта для рыфмоўкі (гл. ўвагу да в. № 9).

17. Восень.

У тэкст радкоў 32 і 33 гэтага вершу ўнесены наступныя зьмены, узятыя з аўтографу—п. XV. 2. 16/24. (гл. вышэй агульную заўвагу):

32 р. Цяжкія думкі мне ў сэрца прыйшлі.

33 р. Нешта старое усё ўспамінаецца...

У выданьні 1918-га году было:

Думкі мне ў сэрдца жудосны прыйшлі.
Старое нешта усё спамінаецца...

18. Маё думкі.

8 р. „жы*ц*ьце“ зам. „жыць*ц*ё“ ўжыта, як звычайна, для рытму (гл. заўвагу да в. № 9).

20 р. „І ізноў сваю твар захавала“. У выданьні 1918-га году было „І зноў“... Згодна з запатрабаваньнем рытму (анапест) выпраўлена „І ізноў“. „Твар“ А. Гарун ужывае як слова жаночага роду—„сваю твар“.

29 р. У выданьні 1918-га году стаяла „слонца“; прынята—„сонца“ ў адпаведнасьці з 12-м радком, дзе стаіць „сонца“ (гл. заўвагу да в. № 4).

19. Навакол.

Апошняя строфа мае, як відаць, такі сэнс: „Вятры—твае адзіныя паны і твая ганаровая варта“. У адпаведнасьці з сэнсам прынята і інтэрпункцыя ў гэтай строфе.

20. Ветру.

12. „Слонца“.—У А. Гаруна спатыкаюцца „сонца“ і „слонца“ (гл. заўвагу да в. № 4).

21. Завіруха.

39 р. ...„рады“. Гл. заўвагу да в. № 15, р. 36.

22. Думы ў чужыне.

12 р. „мяжэ“ зам. „мяжы“ пакінута згодна з запатрабаваньнем рыфмоўкі (10 р.—„сьцеражэ“).

27 р. „*ы*цьце“ зам. „быцьцё“—гл. заўвагу да в. № 9.

30 р. „Я-бы“... У выд. 1918-га году стаяла „Як-бы“. Выпраўлена на падставе аўтографу („сшытак“, стар. 23—27).

35 р. У выданьні 1918-га году стаіць „І не зайздрошчу багацтву тых марнаму“. На падставе аўтографу („сшытак“, стар. 23—27) Прынята: „І не зайздрошчу багацтву я марнаму“.

62 р. „у глыбіне“ (зам. „глыбіні“) пакінута згодна з запатрабаваньнем рыфмы (у 64-м р.—„старане“).

44, 45, 50, 79 рр. „*ж*ы*ц*ьце“ зам. „жыцьцё“ — гл. заўвагу да в. № 9.

90 р. „Я-ж не прайшоўшы“... У аўтографе („сшытак“, стар. 27)—„Я-ж не прайшоўшый“.

23. З песьняў няволі.

42 р. „Войскам буйным а зухвалым“. А. Г. часьцей, чым звычайна, ужывае „а“ зам. злучніка „і“.

24. За тысячу вёрст ад радзімага краю...

4 і 15 рр. „Украіне“ і „Украйну“ зам. „Украіне“ і „Украіну“ — гл. заўвагу да № 9.

Да 17-га радка вершу („Вее вецер, сонца грэе“) у выданьні 1918-га году дадзена зноска: „Узьлюбёны абраз Т. Г.“.

25. Эх, сягоньня, ў гэту ночку.

15 р. ...„па-над дахам“. У выданьні 1918-га году стаяла „на-пад дахам“. Выпраўлена на падставе аўтографу („сшытак“, стар. 102).

26. На сьмерць.

Верш вельмі эмоцыянальны, але не апрацаваны, напр. 17-ты радок мае залішні склад: „і торганьня разлукі ня так катуюць строга“. Чацьверты і пяты радкі невыстарчальна ясны. За адсутнасьцю аўтографаў і іншых друкаваных тэкстаў гэтага вершу Камісія ня мела магчымасьці іх выправіць.

15 р. У выданьні 1918-га г. стаіць: „у чужчстве“. Гэтае напісаньне палічана за друкарскую памылку і выпраўлена „у чужацтве“.

27. Думкі-дыямэнты, краскі жыцьця.

1 р. „Думкі-дыямэнты“ і 5 р. „Жы*ц*ьце-няволя“ (зам. „дыямэнты“, „жыцьцё“)—гл. заўвагу да в. № 9.

28. Вясна.

У 17-18 радкох парушаны рытм, замест звычайнага памеру—дактылю ўжыты амфібрахі:

Ўзьляцелі высока над сосны, над елі
І недзе прапалі ў нябескім касьцеле...

29. Nocturno.

10 р. „Дзянькі мае маркотныя чаму?“—Пакінута інтэрпункцыя выданьня 1918-га г. У аўтографе стаіць пытальнік і ў канцы 12-га радка.

12 р. „Як душы грэшныя“... У выд. 1918-га году было: „думы грэшныя“. Папраўка ўнесена на падставе аўтографу (XV. 2. 23/32).

37 р. ...„і ту-ж“ зам. „і тут-жа“ згодна з вымаганьнем рытму.

42 р. ...„можучы“... Пакінута бяз зьмены напісаньне выд. 1918-га г.

49 р. „Няма пакуты дзе—няма пазнаньня“. Прынята інтэрпункцыя аўтографу (XV, 2. 23/32). У выданьні 1918-га году: „Няма пакуты, дзе няма пазнаньня“.

30. Дзяўчыначка-сэрца...

19 р. ...„задарма“. У выд. 1918-га году і ў аўтографе стаіць „з-за дарма“.

31. Мая люба.

19 р. ...„уласныя“—у значэньні рас. „властные“.

33. Ідуць гады.

14 р. „пача́лася“ зам. „пачалося“—гл. заўвагу да в. № 9.

20 р. „Ўздагонь“ (зам. уздагон) пакінута як асаблівасьць лексыкі поэты.

36. Як ліст вярбінкі маладой...

12 р. „У мора я.— А вернешся назад?“ У „Матчыным Дары“ было „У мора сіняе“... Тэкст выпраўлены на падставе аўтографу („сшытак“, стар. 125) для захаваньня памеру вершу, бо ў тэксьце „М. Д.“ у гэтым радку была адна залішняя стапа.

У 18-м радку „Цячы ракой з-пад горнае грады“—прыняты аўтарскі тэкст на падставе гэтага-ж аўтографу. У „М. Д.“ было: „з-над“.

37. Нязнаны госьць.

10 р. ...„неабачны“—рэдкае ў нашай літаратурнай мове слова.

12 р. „Па іншаму жыцьцю“... У выданьні 1918-га году і ў аўтографе (XV. 2. 22/31) стаіць „па іншаму жыцьці“, зварот, у якім мы маем нязвычайнае дапасаваньне—месны назоўніка і давальны прыметніка. З прычыны таго, што поэта тут меў на ўвазе, як відаць, конструкцыю з давальным склонам, гэты зварот выпраўлены—„па іншаму жыцьцю“.

38. Матчын дар.

5 р. ...„з тугай“ зам. „з тугой“ выданьня 1918-га году прынята для захаваньня памеру вершу на падставе аўтарскай папраўкі, якая была ім зроблена на выдрукаваным у „Нашай Ніве“ паасобніку вершу (Рукапісы А. Гаруна XV. 2. 25/34 б).

10 р. „Як-жа шанаваці“. У выд. 1918-га г. было: „Як іх шанаваці“. Папраўка ўнесена на тэй-жа падставе, як і папярэдняя (гл. 5 радок).

40. Літаньне адзіноце.

10 р. ...„упады“ — у слоўніку Насовіча тлумачыцца як „старание угодить“.

41. Начлег.

6 р. ...„дзесь“—у выд. 1918 г. „гдзесь“.

42. Скажы, братухна...

12 р. Слова „нявісны“ поэта ўжыў у сэнсе „нявідучы“, „сьляпы“. Параўн. слоўнік І. Насовіча ст. 328: „нявісьнець, занявісьнець—потемнеть“. „Вочы мае нявісьнеюць, занявісьнелі“.

44. З. Б-КУ.

У першай строфе двукосьсі прастаўлены на падставе аўтографаў (XV. 2. 28/37 і „сшытак“, 130 стар.).

16 р. ...„лютаваньне“. У выданьні 1918-га году было „матаваньне“. Выпраўлена на падставе аўтографу („сшытак“, 130 стар.).

46. Поэту.

2 р. „Мне сэрца кроіцца“ і 11 р. „ў канечнае патрэбе“ — прыклады нязвычайных зваротаў і дапасаваньняў, якія часам спатыкаюцца ў вершах А. Гаруна (гл. вышэй агульную заўвагу).

Да 87-й стар. „Праявы роднага“. У выданьні 1918-га году надрукавана—„прыявы“.

47. Слабасьці.

14 р. „спачуцьця“. У выд. 1918-га году і ў аўтографе маем „споўчуцьця“.

Да апошняй строфы з даволі няясным сэнсам даецца варыянт чарнавога аўтографу (XV. 2. 29/38):

Пусьці, праклятая, з тваіх ласкавых шпон, —
Няхай памру, калі ня буду жыў я,
Абы мне (ня) споўніўшы сьвяты жыцьця закон,
Абы ня згінуў я.

52. Вецер.

У першых строфах, як часта ў А. Гаруна, па запатрабаваньнях рытмікі парушаецца акцэнтоўка: — „вàдой“ зам. „вадой“.

9 р. „слóўца“ зам. „слаўцо“ выданьня 1918-га году прынята на падставе аўтографу (XV. 2. 32/44) у адпаведнасьці з рытмам.

53. У прыпар.

Рытміка гэтага вершу зьмешаная і месцамі нявытрыманая, напрыклад, у апошнім радку зьменены граматычны націск: „усімà“ зам. „усіма“.

57. Асеньні сьпеў.

14 р. ...„жагнаньне“ ўжыта ў сэнсе „разьвітаньне“.

58. Песьня.

27 р. ...„любы“ пастаўлена ў коскі, бо паводле сэнсу „любы“ лепей разумець як зваротак; у аўтографе пасьля гэтага слова стаіць коска; у выд. 1918-га г.— „У другія вочкі любы не ўглядайся“ (бяз косак).

59. Хаўтуры.

10 р. ...„мужанька“. У выданьні 1918-га году — „мужалька“. Выпраўлена на падставе аўтографу („сшытак“, стар. 127).

61. Два каханьні.

35 р. „І ў канцы *ся стала,* чаму была стаці“... нязвычайная для сучаснай беларускай мовы дзеяслоўная форма („ся стала“).

48 р. ...„у каласістым полі“. У выданьні 1918-га году „каласістум полю“, у аўтографе (XV, 2, 35/48)—„каласістум полі“.

62. Казка.

23 р. ...„барабанюць“ зам. „барабаняць“ для рыфмы.

43 р. ...„злосна прагавіты“. У выданьні 1918-га году было „злога“. Выпраўлена на падставе варыянту „Нашае Нівы“ (1913 г. № 48).

65. Жабрачка.

49 р. „пажэжы“ ўжыта поэтам у сэнсе „пажару“.

66. Сын.

18 р. ...„доле“ поэтам ужыта ў сэнсе „ў глыбіні“.

27 р. „Ды да роднай маткі к сэрцу прыгарнуцца“... У выд. 1918 году было „Да радзонай маткі“... Выпраўлена на падставе аутографу („сшытак“, стар. 57-58).

67. Журба і сьмехацьцё.

У выданьні 1918-га году ў загалоўку стаяла „сьмяхоцьце“. Камісіяй у адпаведнасьці з тэкстам вершу (радкі 9, 15, 31 і інш.) выпраўлена на „сьмехацьцё“.

70. Варажба.

13 р. „Эмільля“—пакінуты правапіс выданьня 1918-га году.

52 р. ...прарваліся шамы“. У выданьні 1918-га году стаяла „тамы“. Выпраўлена на падставе аўтографу (XV, 2. 36/49).

61-62 р.р. Пунктуацыя выд. 1918-га году зьменена паводле аўтографу. У выд. 1918 г.:

Маткі заступніца, — пані старая,
Пан, як-бы родны, — нявесела жыць!

93 р. ...„аб ёй прысягаў“ ужыта поэтам у сэнсе „прысягаў“ (кляўся) ёй“

129 р. „Урода“ А. Г. ужывае ў мужчынскім родзе.

143 р. „Панна у ночы гасьцей прынімае“. У выданьні 1918-га году было: „Панна у ночы госьцяў прымае“. Папраўка ўнесена для захаваньня рытмікі на падставе аўтографу (XV. 2. 36/49).

153 р. „Эмілії“ зам. „Эмілі“ выд. 1918-га г. на падставе аўтографу.

159 р. ...„маёі“. У выд. 1918-га г. „маеі“. Выпраўлена на падставе аўтографу (XV, 2, 36/49).

203 р. — „Люблю — кажа панна: — люблю... адпусьці!“ У пачатку радку поэтам ужыты залішні склад, дзякуючы чаму парушыўся рытм.

71. Канец Паўлючонка.

78 р. ...„райтараду“... нязвычайнае слова, утворанае, як відаць ад нямецкага „Reiteгei“ — язда (верхам).

72. Шчасьце Мацея.

120 р. „Конь пад ім гуляе“... У выданьні 1918-га г. стаяла памылкова „над“.

145 р. „Шчасьце знойдзеш так сваё“. У выд. 1918-га г. стаяла „знойдзем“; яно не давала сэнсу і таму выпраўлена на „знойдзеш“.

З Ь М Е С Т

Стар.

Прадмова *І. Замоціна* 1

А. Гарун і яго „Матчын дар“— *А. Барычэўскага* 3

———

1. Людзям 5

Роднаму краю.

2. *** Чаму з маленства, з ураджэнства 7
3. Начныя думкі 9
4. *** Як надарыцца мінута . . 11
5. *** Хай ня льлюцца дажджы цёмна-хмарныя 13
6. *** Мілая, родная старонка-маці 14
7. Ваўкалакі 15
8. Іванку 16
9. *** Ты, мой брат, каго зваць Беларусам 18
10. Юдам 20
11. Песьня — звон 22
12. *** Усе з аднэй мы выйшлі нівы 24
13. Песьня 25

На чужыне.

14. У выгнаньні 27
15. Вясельле 28
16. Журба 30
17. Восень 31
18. Мае думкі 33
19. Навакол 35
20. Ветру 38
21. Завіруха 39
22. Думы ў чужыне 41

Стар.

23. З песьняў няволі 45
24. *** За тысячу вёрст ад радзімага краю 48
25. *** Эх, сягоньня, ў гэту ночку 51
26. На сьмерць 53
27. *** Думкі-дыямэнты, краскі жыцьця 56
28. Вясна 57
29. Nocturno 59
30. *** Дзяўчыначка-сэрца, сябе ня трывож 62
31. Мая люба 63
32. *** Хто сказаў: „і я з народам“ 64
33. Ідуць гады 65
34. Навука 66
35. Адбітак 67
36. *** Як ліст вярбінкі маладой 68
37. Нязнаны госьць 69
38. Матчын дар 70
39. Змора 71
40. Літаньне адзіноце 72
41. Начлег 74
42. *** Скажы, братухна, калі параньне? 75
43. Ноч 76
44. *** Хрыстос нарадзіўся! Хрыстос нарадзіўся! 78
45. Малітва 79
46. Поэту 81
47. Слабасьці 82
48. Жыцьцё 84
49. Муляру 85

Праявы роднага.

50. Вясна. I. Дзе дадуць — зраблю пазыку 87
51. Вясна. II. Вясна прыйшла . . 88
52. Вецер 89
53. У прыпар 91
54. Добрыя дзеці 93
55. Салавейка 94
56. Дзяўчаці 95
57. Асеньні сьпеў 96
58. Песьня 97
59. Хаўтуры 99
60. Мяцеліца 100
61. Два каханьні 101
62. Казка 103
63. Хатка 106
64. Габруська 108
65. Жабрачка 110
66. Сын 113
67. Журба і сьмехацьцё . . . 115
68. Спрэчка 117
69. Каму што 120
70. Варажба 123
71. Канец Паўлючонка 132
72. Шчасьце Мацея 142

Увагі — *Укл. В. Мачульскім* 149

Об 79276

227310

Бел. аддзел
1994 г.

Республіканская
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

Цана 1 р. 50 к.

0-60

B0000003 119596